Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

24 МАЯ 2022 г. АЎТОРАК

№ 99 (29721)

ЗВЯЗДА

«ВЫТОКІ» Ў РЭЧЫЦЫ 3

БАГАЦЦЕ МАЗЫРСКАГА КРАЮ 5-8

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ГЭТА ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ»



Прэзідэнт Беларусі ўчора знаходзіўся з рабочым візітам у Расійскай Федэрацыі. На перагаворы з калегам Уладзімірам Пуціным у Сочы Аляксандр Лукашэнка адправіўся яшчэ ў пятніцу. Аб гэтай сустрэчы сам-насам яны дамовіліся на саміце АДКБ, які праходзіў 16 мая ў Маскве. На мінулым тыдні падчас візіту ў Палац Незалежнасці губернатара Ніжагародскай вобласці Глеба Нікіціна Аляксандр Лукашэнка расказаў, што адной з тэм размовы стане імпартазамяшчэнне — як праблема нумар адзін для эканомік дзвюх краін ва ўмовах санкцый.

Беларускі лідар падкрэсліў, што эканоміка ў Саюзнай дзяржаве на фоне санкцыйнага ціску нечакана інтэнсіўна ўмацоўваецца.

«Вельмі важна (вы неяк гэта адзначалі), што эканоміка ў Расіі і наогул у нас у саюзе не проста ўмацоўваецца, а нечакана інтэнсіўна ўмацоўваецца. Вазьміце інфляцыю, вазьміце беспрацоўе. Яно аказалася меншым. Падае ўзровень беспрацоўя. Гэта добра. Ну, і рубель умацоўваецца шалёнымі тэмпамі. Каб мы тут не перабралі. Таму нечаканыя рэчы адбываюцца. Ну, гэта для іх нечаканыя. Мы вось чакалі, што гэта будзе. Гэта час магчымасцяў. І яны (Захад), самі не разумеючы таго, нас падштурхнулі займацца больш інтэнсіўна сваёй эканомікай», — перадае словы кіраўніка беларускай дзяржавы яго прэс-служба.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўрады Беларусі і Расіі на даручэнні кіраўнікоў дзяржаў вызначылі асноўныя напрамкі ў сферы імпартазамяшчэння і нават пайлічылі ў першым набліжэнні, у колькі гэта абыдзецца. «Грошы зусім невялікія. Я не хачу публічна зараз называць, таму што яны прыкладныя. Зусім смешныя грошы. Але мы выйдзем на асноўныя момантах, дзе ў нас не хапае камплектуючых і іншага на добрае імпартазамяшчэнне, — упэўнены Прэзідэнт. — Я ўжо не гавару па лініі бяспекі. Мы ўжо добра працуем у сферы бяспекі па выторчасці таго, што трэба нашай сумеснай арміі, якая тут дзейнічае».

Прэзідэнт працягнуў, што ў краін вялізны рынак, ёсць рэсурсы, тэхналогіі. «Ну, а што адбываецца там (на Захадзе. — **«Зв.»**), яны відавочна недаацанілі. Яны жылі, чытаючы свае СМІ, ну і атрымалі, і інфляцыю ў тым ліку... Праўда, Пуцін вінаваты. Там ва ўсім вінаваты Пуцін», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

У час сустрэчы Прэзідэнт Расіі падкрэсліў, што адной з ключавых тэм перагавораў таксама з'яўляецца ўмацаванне прамысловай кааперацыі. «Зразумела, адно з ключавых пытанняў — гэта... Усе, напэўна, чакаюць, што я скажу: энергетыка — гэта важна, але перш за ўсё — прамысловая кааперацыя. Вы таксама неаднаразова ставілі пытанне аб тым, каб нам тут зрабіць дадатковыя крокі наперад», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Паводле яго, у краін вельмі шмат кірункаў сумеснай работы. «Ёсць пра што пагаварыць. Я ўжо не кажу аб далейшых працэсах, звязаных з будаўніцтвам Саюзнай дзяржавы. Тут мы, як і дамаўляліся, робім усё спакойна, без усялякага спеху. Кожны крок вывяраем з тым, каб кожны гэты крок умацоўваў нас знутры, звонку, умацоўваў нашы палітычныя сістэмы. Стваралі бы ўмовы для іх развіцця», — дадаў Уладзімір Пуцін.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што і ў сферы бяспекі на сустрэчы ёсць аб чым паразмаўляць, асабліва ў сувязі з тым, што НАТА канцэнтруе войскі на заходніх рубяжах.

«Ёсць цікавыя нейкія рэчы нечакана ва Украіне. Вы гэта цудоўна ведаеце. Нас, ды і вас гэта павінна турбаваць, што яны (палітыкі) ужо робяць крокі да таго, каб раздзяліць Украіну. Нас турбуе тое, што яны гатовыя, — палякі, натаўцы — выйсці, «дапамагчы» такім чынам забраць, як да 1939 года, Заходнюю Украіну. Нас гэта насцярожвае не толькі з пункту гледжання сённяшняй бяспекі. Гэта іх стратэгія і па Заходняй Беларусі. Таму мы вуха востра трымаем. І, як я казаў, яшчэ ўкраінцам давядзецца нас прасіць, каб мы не дапусцілі адрыву гэтай заходняй часткі і іншых частак ад Украіны. Гэта мая такая пазіцыя, але вы гэта дакладна ведаеце, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Тут у нас таксама праблем не менш, але ўжо не нашых праблем. Іх праблемы, якія нам давядзецца вырашаць. Учарашнія незразумелыя павадзіны ў Кіеве Прэзідэнта Дуды (Прэзідэнт Польшчы Анджэй Дуда. — **«Зв.»**.). Дарэчы, які практычна нічога не вырашае ў Польшчы. Займаецца гэтымі фэйкамі».

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што Беларусь і Расія паспяхова вырашаць праблемы ў сферы бяспекі. «У бяспецы вы маеце рацыю, я вас падтрымліваю. Тут у нас праблем нямала. Але іх будзем разшаць. Мы нічога не баімся. Як у былыя часы гаварылі, наша справа справядлівая, і рана ці позна мы ўсё роўна пераможам», — падкрэсліў беларускі Прэзідэнт.

СТАР. 2

Добрага гаспадара па збанку відаць

Да канца лета па выхадных днях на мемарыяльным комплексе «Курган Славы» будуць праводзіцца выставачныя мерапрыемствы, прысвечаныя Году гістарычнай памяці. Арганізатарам праекта выступіў Мінскі аблвыканкам. Днямі каля Кургана Славы разгарнулася выстава, якая прадстаўляе Барысаўскі раён.

Акрамя гэтага, свае экспазіцыі на Кургане Славы прадставілі Мінскае дзяржаўнае выторчае лесагаспадарчае аб'яднанне, камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і КУП «Мінаблкінавідзапракат».

На здымку: **майстар Мікалай РУДЗЯНКОЎ.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Вольга РУСІНОВІЧ, дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі:

«Паслядоўная дзяржаўная палітыка, накіраваная на стварэнне спрыяльных умоў вядзення бізнесу, садзейнічала станоўчай дынаміцы ключавых паказчыкаў работы суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

На пачатак года іх колькасць узрасла пераважна за конт ІП і мікраарганізацый.

Як правіла, з гэтага сегмента людзі пачынаюць рабіць свае першыя крокі ў бізнесе.

І для нас важна, што шмат беларусаў летась вырашыла адкрыць сваю справу.

Топ відаў дзейнасці ў цэлым тут не змяніўся. У яго ўвайшлі гандаль, транспарт, будаўніцтва і прамысловасць. Але пры гэтым аналіз дынамікі асноўных фінансава-эканамічных паказчыкаў МСП сведчыць аб росце эфектыўнасці бізнес-мадэляў. Аб'ём прамысловай вытворчасці ўзрос практычна ў 1,3 раза. Выручка ад рэалізацыі павялічылася ў 1,2 раза. Рэнтабельнасць продажаў склала 8,4 працэнта, а ў мікраарганізацый — 12 працэнтаў. Як вынік, назіраюцца станоўчыя тэмпы росту ўзроўню заробкаў работнікаў і падаткавых адлічэнняў у бюджэт».

Ураджай-2022

СІЛА ЗЯМЛІ

У сельгаспрадпрыемствах Віцебскай вобласці завяршаецца пасадка другога хлеба беларусаў — бульбы. У механізатараў і кіроўцаў гарачая пара: трэба максімальна выкарыстаць кожны пагодлівы дзень, каб залажыць аснову будучага ўраджаю. У бягучым сезоне пад бульбу ў Віцебшчыне адведзена звыш 1,8 тысячы гектараў, 110 з іх — у вытворчым кааператыве «Альгоўскае» Віцебскага раёна. Даведацца, як ідуць пасяўныя справы ў гаспадарцы, мы накіраваліся на поле аддзялення «Бабінічы».

Нам пашанцавала заспець работнікаў на кароткім адпачынку. На полі — гатовыя да работы тры МАЗы, напоўненыя адборнай насеннай бульбай. Цяпер садзяць «Скарб суперэліта» — добры сорт па ўраджайнасці і таварнасці, прыдатны для вырошчвання на ўсіх тыпах глебы. Да яго кааператыў высаджвае «Маніфест» — чырвонаклубневую бульбу, якая валодае павышанай устойлівасцю да вірусаў, прыстасаваная да інтэнсіўных умоў вырошчвання — якраз тое, што трэба для зменлівага надвор'я.

СТАР. 2

Прыярытэты дзяржавы

Марына АРЦЁМЕНКА:

«ПАДТРЫМКА ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ І ІНВАЛІДАЎ ПАВІННА АДПАВЯДАЦЬ ІХ ФАКТЫЧНЫМ ЗАПАТРАБАВАННЯМ»

Падаўжэнне працоўнага жыцця і адаптацыя рынку працы да патрэб пажылых грамадзян, магчымасць навучання на працягу ўсяго жыцця, удзел людзей сталага веку ў грамадскім жыцці свайго горада ці раёна — гэта толькі некаторыя падыходы, якія рэалізоўваюцца ў нашай краіне ў адказ на ўсеагульную тэндэнцыю старэння насельніцтва. Сёння ў Беларусі кожны чацвёрты жахар — у пенсіённым узросце. Да 2030 года кожны пяты беларус перасягне мяжу 65-годдзя. Гэта патрабуе і перагляду падыходаў да сацыяльных паслуг пажылым. Як яны будуць мянняцца? Спецыялісты лічаць, што аб'ём падтрымкі павінен адпавядаць фактычным запатрабаванням сталага чалавека і інваліда на аснове прынцыпу «разам, а не замест». Мяркуецца замацаваць і агульны механізм падтрымкі для тых, хто клапоціцца пра старых. Пры гэтым пасяленне ў дом-інтэрнат мусіць быць крайняй мерай — старэць усё ж лепш дома. Важна і змяняць стаўленне ў грамадстве да старэйшага пакалення як да людзей «элегантнага ўзросту», якія з'яўляюцца носьбітамі мудрасці і вялікага жыццёвага вопыту. Пра падтрымку пажылых людзей і тое, як яна мусіць мянняцца, «Звязда» распытала намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Марыну АРЦЁМЕНКУ.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У МВФ заявілі аб найгоршым з часоў Другой сусветнай вайны стане эканомікі

Стан сусветнай эканомікі цяпер можа быць найгоршым з часоў Другой сусветнай вайны. Пра гэта паведамляе Міжнародны валютны фонд.

«У той час як палітыкі і бізнес-лідары адпраўляюцца ў Давос, сусветная эканоміка сутыкаецца, магчыма, з самым сур'ёзным выпрабаваннем з часоў Другой сусветнай вайны», — адзначылі ў МВФ.

У фондзе дадалі, што гэта адбылося з-за пандэміі каранавіруса, сітуацыі ва Украіне, а таксама пагрозы змены клімату. Усе гэтыя фактары прывялі да росту інфляцыі, калі падскочылі цэны на прадукты і энерганосьбіты, што стала цяжарам для канчатковых спажыўцоў.

У МВФ палічылі, што для вырашэння існуючай сітуацыі неабходна аслабіць гандлёвыя абмежаванні. Тады дэфіцыт тавараў паступова нейтралізуецца, а цэны на прадукты і іншыя тавары знізяцца. Акрамя таго, неабходны калектыўны ўдзел у вырашэнні праблемы запазычанасці краін, мадэрнізацыі трансгранічных плацяжоў і змянення клімату.

Пазіцыя Турцыі і Харватыі па пашырэнні НАТА сведчыць аб расколе ў альянсе

Рэзкая нязгода прэзідэнтаў Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана і Харватыі Зорана Міланавіча аб уступленні дзвюх скандынаўскіх краін у альянс падкрэслівае праблему нарастаючага расколу ў ўнутры НАТА, піша кітайскі партал Global Times.

Зоран Міланавіч заявіў, што даручыць пастаянаму прадстаўніку сваёй краіны ў НАТА праласаваць супраць. Ён лічыць, што Фінляндыя і Швецыя могуць быць дапушчаны да ўступлення ў арганізацыю, калі будзе вырашана пытанне аб роўнасці харватаў у Босніі і Герцагавіне на выбарах. Таксама ён выступае супраць уступлення Украіны ў НАТА.

Паводле слоў навуковага супрацоўніка Кітайскага інстытута сучасных міжнародных адносін Сунь Кэцыня, ва ўсіх 30 членаў альянсу розныя патрабаванні да бяспекі. НАТА пад кіраўніцтвам ЗША спрабуе разыграць так званую расійскую пагрозу і рэалізаваць геаэканамічныя і геапалітычныя інтарэсы Амерыкі шляхам экспансіі.

«НАТА просіць сваіх членаў падпарадкоўвацца інтарэсам Вашынгтона ў процістаянні Маскве, ігнаруючы пры гэтым інтарэсы краін. Гэта яшчэ больш абвастрае супярэчнасці паміж рознымі палітычнымі сіламі ўнутры Еўропы і падштурхоўвае кантынент да яшчэ большай нявызначанасці», — гаворыцца ў артыкуле.

Амерыка імкнецца аслабіць Расію, але многія члены альянсу не згодныя з тым, што Масква складае пагрозу бяспецы.

САА3: захваральнасць на COVID-19 расце амаль у 70 краінах свету

Сусветная арганізацыя аховы здароўя папярэдзіла аб аднаўленні росту COVID-19 у свеце. Павелічэнне колькасці захворванняў фіксуецца амаль у сямідзесяці краінах свету, паведамляе ТАСС.

Кіраўнік САА3 Тэдрас Гебрэсэус адзначыў, што медыкі рэгіструюць рост колькасці інфіцыраваных каранавірусам, у той час як у цэлым у краінах свету значна знізілася тэсціраванне на SARS-CoV-2. Тэдрас Гебрэсэус лічыць, што супрацьстаяць новай хвалі захваральнасці можна з дапамогай павелічэння тэмпаў вакцынацыі. Акрамя таго, на думку кіраўніка САА3, урадам краін трэба быць гатовымі да аднаўлення дзеяння абмежавальных мер.

Гебрэсэус таксама адзначыў, што каранавірус даволі непрадказальны, спецыялісты пакуль не могуць упэўнена спрагназаваць далейшае развіццё пандэміі.

Паводле даных на 20 мая, з пачатку пандэміі ў свеце каранавірусам заразіліся 521 920 560 чалавек, у тым ліку 6 274 323 пацыенты памерлі з-за хваробы.

КОРАТКА

• Распубліканскі старт летняй аздараўленчай кампаніі дадуць 30 мая ў «Зубраніцы».

• У Беларусі ў студзені — красавіку пабудавалі 14,1 тысячы кватэр.

• Тры высокатэхналагічныя апараты УГД пачалі працаваць у Віцебскім абласным дыягнастычным цэнтры.

• Ва Узброеных Сілах Беларусі пачаўся чарговы этап праверкі сіл рэагавання.

• Беларускія пенсіянеры аддалі махлярам больш за Br3 млн. У большасці выпадкаў пенсіянеры запэўнівалі, што гэта быў голас іх блізкага чалавека і яны не маглі паступіць інакш.

• Канцэрт пад адкрытым небам, майстар-класы і фэнтэзі-спектакль: у Полацку адзначаць 1160-годдзе горада. Святкаванне круглай даты пачнецца 27 мая.

Трыялогія

ЛАНДШАФТ ПАМЯЦІ: ТЭМА ГЕНАЦЫДУ Ў БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦТВЕ

Тэма, якая ніколі не стане менш балючай... Трагедыя, якую перажылі жыхары Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны... Генацыд. Халакост... Якая гісторыя яе адлюстравання ў мастацтве, як асэнсоўваюць яе сённяшнія беларускія творцы? Паразважаць пра гэта мы сабраліся ў мемарыяльнай майстэрні архітэктара Леаніда Левіна, адзнаго з аўтараў мемарыялаў «Хатынь», «Шунеўка», «Красны Берар». Мае суразмоўнікі — дачка Леаніда Левіна, архітэктар Галіна Левіна, якая таксама стварыла не адзін праект на гэтую тэму, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Надзея Усава, якая з'яўляецца куратарам выставы «Ніколі больш!», што адкрылася да Дня Перамогі ў музеі. А я, пісьменніца Людміла Рублеўская, з дзяцінства чула ад маёй маці, Галіны Міхайлаўны, страшныя расповеды пра вайну, і як яна, маленькая, выратавалася з вогненнай вёскі — Люці Ігуменскага павета, уцякла проста з падпаленай адрыны, куды карнікі сагналі жыхароў, як схавалася ў жыце... Як на папялішчы перабірала каменьчыкі, што ўтварыліся ад спеклага шкла... А пад попелам былі косці.

СТАР. 9

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 - 763X

220099

9 771990 763008

Ігар СЕРГЕЕНКА:

«Індывідуальны падыход і новыя формы работы з моладдзю»

Для работы з моладдзю сёння трэба шукаць ідывідуальны падыход і новыя формы работы. Такую думку на чарговым пасяджэнні Мінскага аблвыканкама выказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка, паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу Мінаблвыканкама.

На парадак дня пасяджэння былі вынесены такія актуальныя пытанні, як рэалізацыя дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі і меры па замацаванні маладых спецыялістаў у Мінскай вобласці, а таксама падрыхтоўка ўстаноў адукацыі Мінскай вобласці да 2022/2023 навучальнага года.

Удзел у пасяджэнні ўзяў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка. «Маладзь людзі сёння не хочуць стаяць у чарзе пакаленняў, а жадаюць атрымаць усё і адразу, узровень жадання ў іх вельмі высокі. Як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, прыярытэт у маладзёжным асяроддзі аддаецца не столькі заробку, колькі самарэалізацыі», — сказаў Ігар Сергеенка.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуў увагу на такую актуальную праблему, як незаменнасць працоўных рэсурсаў у важных галінах эканомікі. Сярод іх ён указаў сельскую гаспадарку, прамысловасць, ахову здароўя і іншыя сферы. «Удумайцеся: да 50 працэнтаў моладзі вымывае сфера паслуг. У той час як на прадпрыемствах рабочы каля станка не можа выйсці на пенсію, таму што яго няма кім замяніць. Таму прафарыентацыйная работа — задача не толькі сістэмы адукацыі. Кіраўнікі прадпрыемстваў, установ, арганізацый павінны ведаць не толькі лічбы прыёму ў штат маладых людзей. Задача кіраўніка — праяўляць увагу да маладога спецыяліста на ўсіх этапах яго жыццядзейнасці, размаўляць, праяўляць зацікаўленасць у яго лёсе, імкнуцца вырашыць яго праблемы. Кожны кіраўнік павінен думаць, што прыйдзе ў калектыў на змену вопытным працаўнікам», — лічыць Ігар Сергеенка.

На думку кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, найважнейшым фактарам замацавання спецыялістаў у рэгіёнах з'яўляецца забеспячэнне жыллём. У гэтым напрамку ў краіне ў цэлым, і ў Мінскай вобласці ў прыватнасці, робіцца шмат. Таксама ён зазначыў, што прадпрыемствы і арганізацыі могуць падтрымліваць сваіх маладых работнікаў дадатковымі выплатамі і прэміямі. Ігар Сергеенка падкрэсліў, што толькі каардынаваная работа мясцовай вертыкалі і асабістая зацікаўленасць кіраўнікоў працоўных калектываў, дзе непасрэдна працуюць маладыя спецыялісты і рабочыя, комплексны індывідуальны падыход, новыя формы работы, адыход ад фармалізму дадуць магчымасць забяспечыць якасную і дзейсную рэалізацыю маладзёжнай палітыкі.

Кропкі над «і»

ВЫПУСКНЫЯ ВЕЧАРЫ — ТОЛЬКІ Ў ШКОЛЕ

Рэспубліканскае свята «Апошні званок» прайдзе 27—28 мая ў Маладзечне на лядовай арэне «Алімпік-2011». Гэта мерапрыемства ўжо становіцца добрай традыцыяй, адмаўляліся ад яго толькі адзіночкі, калі свае карэктывы ўнесла пандэмія каранавіруса.

— Сёлета ўдзельнікамі выпускога стануць 1,5 тысячы хлопцаў і дзяўчат з усіх рэгіёнаў краіны, — расказала **кансультант упраўлення сацыяльнай, выхавачай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК**. — Падчас правядзення рэспубліканскага свята пройдуць цырымоніі ўскладання кветак да мемарыяла ў Парку Перамогі, урачыстае шэсце калоны выпускнікоў па горадзе. На традыцыйі адбудзецца ўзнагароджванне найлепшых выпускнікоў: гэта пераможцы міжнародных, рэспубліканскіх алімпіяд, спаборніцтваў, турнірaў, тыя, хто паспяхова зарэкамендаваў сябе ў грамадскай рабоце, пераможцы розных творчых конкурсаў. Пасля ўрачыстасцяў выпускнікоў чакае маладзёжная дыскатэка з удзелам папулярных эстрадных выканаўцаў і феерверк. На наступны дзень, пасля агляднай экскурсіі па Маладзечне, адзінаццацікласнікі раз'едуцца па сваіх рэгіёнах.

А 30 мая апошнія званкі прагучаць для ўсіх выпускнікоў беларускіх школ. Сёлета дзевяты клас'і у нашай краіне заканчвае 97,7 тысячы хлопцаў і дзяўчат, а 52,3 тысячы навучэнцаў — адзінаццатыя.

Выпускныя вечары, падчас якіх выпускнікі атрымаюць дакументы аб адукацыі, пройдуць 10 чэрвеня.

Пытанне, якое традыцыйна хвалюе адзінаццацікласнікаў і іх бацькоў: дзе можна правесці выпускны вечар, каб ён запомніўся ўсім?

— Нашым загадам устаноўлена, што выпускныя вечары праводзяцца ва ўстановах адукацыі. У выключных выпадках яны могуць праводзіцца ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі або ва ўстановах культуры, — падкрэсліла Ларыса Емяльянчык. — Забаўляльныя комплексы, аграсядзібы і рэстараны для школьных мерапрыемстваў не падыходзяць. Час, працягласць і месца правядзення выпускных вечароў вызначаюцца кіраўніком установы адукацыі з удзелам бацькоўскага камітэта і па згодзе з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ўлады.

Ларыса Емяльянчык прапанавала ўсім зацікаўленым азнаёміцца з Загадам Міністэрства адукацыі № 164 ад 27 сакавіка бягучага года, які можна знайсці на інтэрнэт-партале Міністэрства адукацыі. «Згодна з дакументам, асабістая адказнасць за стварэнне бяспечных умоў пры правядзенні масавых мерапрыемстваў па правядзенні выпускных вечароў ускладаецца на начальнікаў галоўных упраўленняў па адукацыі аблвыканкамаў, старшыню Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама і кіраўнікоў устаноў адукацыі. Дадзеным загадам рэгламентаваны таксама змест сцэнарыяў выпускных вечароў і свята «Апошні званок».

Надзея НІКАЛАЕВА.

«ПАДТРЫМКА ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ І ІНВАЛІДАЎ ПАВІННА АДПАВЯДАЦЬ ІХ ФАКТЫЧНЫМ ЗАПАТРАБАВАННЯМ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

НА САЦЫЯЛЬНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ВЕТЭРАНАЎ — КАЛЯ 8 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ

— Марына Барысаўна, сёлета да Дня Перамогі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і асобы, якія пацярпелі ад не наступстваў, атрымалі матэрыяльную дапамогу. Ці шмат засталося людзей, якія маюць на яе права, і наколькі для іх значная гэта падтрымка?

— Ветэраны — гэта здабыткам нашай нацыі. Дзякуючы іх подзвігу мы сёння жывём у суверэннай краіне, працуем, гадуем дзяцей. Аддаючы даніну глыбокай павагі ваеннаму пакаленню, па рашэнні кіраўніка дзяржавы ўстаноўлена штогадовая выплата да Дня Перамогі. У бягучым годзе яна склала ад 750 да 1800 рублёў. Выплата матэрыяльнай дапамогі завершана да 9 мая.

Яе атрымалі нікамі сталі 11,8 тысячы чалавек, агульная сума склала 10,4 мільёна рублёў. Сярод іх ветэранаў крыху больш за дзве тысячы, пераважная катэгорыя, каля дзевяці тысяч, — гэта былыя вязні фашысцкіх канцлагераў і гета.

Уручэнне матэрыяльнай дапамогі ветэранам, якія атрымліваюць яе дома або ў сацыянарных установах сацыяльнага абслугоўвання, было арганізавана ва ўрачыстай абстаноўцы з удзелам кіраўніцтва выканкамаў, грамадскіх аб'яднанняў, устаноў адукацыі, прафсаюзаў. Гэтыя традыцыі будуць працягнутыя, таму што матэрыяльная падтрымка — важна, але больш важныя ветэранам нашы клопат і ўвага.

Усведамляючы, што ўдзельнікаў і сведкаў вайны становіцца ўсё менш, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў Год гістарычнай памяці ініцыявала дзве рэспубліканскія акцыі: патрыятычная акцыя-эстафета ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання «Ганаруся подзвігам ветэрана-земляка!» і акцыя сумесна з Міністэрствам інфармацыі «Ваеннае пакаленне — мірнаму пакаленню».

Наша задача — зберагчы і перадаць цярпашнім і будучым пакаленням «жывыя» запаветы ветэранаў, іх звароты да моладзі, бо Год гістарычнай памяці — не толькі памяць аб падзеях і героях, але перш за ўсё і трансляцыя маральных каштоўнасцяў.

Вынікам акцыі «Ганаруся подзвігам ветэрана-земляка!» стане электронная «Кніга памяці», у якую ўвойдзе 45 відэаролікаў з расповедамі ветэранаў. Плануем выпусціць яе да Дня народнага адзінства. Відэаролікі даступныя ў тэлеграм-канале міністэрства.

— Як ящчэ ажыццяўляецца падтрымка ветэранаў? Якія льготы яны маюць?

— Ветэраны ў нашай краіне маюць сацыяльныя льготы ва ўсіх сферах. Гэта ахова здароўя, жыллё, пенсіённае забеспячэнне, сацыяльнае абслугоўванне. Так, для іх прадугледжаны бясплатнае забеспячэнне лекамі, тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, санаторна-курортным лячэннем, бясплатны праезд у пасажырскім транспарце і іншае.

Да пенсіі ветэранам устаноўлены спецыяльныя даплаты. Гэта дадатковая штомесячная выплата, штомесячная «ўзроставая» даплата асобам, старэйшым за 75 гадоў (якія атрымліваюць пенсію ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне), надбаўка на догляд асобам ва ўзросце, старэйшым за 80 гадоў. Сумарны памер штомесячных даплат да пенсіі ўдзельнікам і інвалідам вайны з 1 мая складае ад 311 да 467 рублёў.

Мясцовыя органы ўлады на пастаянній аснове патрануюць ветэранаў, аператыўна выяўляюць іх патрэбы, вырашаючы надзённыя пытанні. Сацыяльныя службы і валанцёры аказваюць дапамогу ў побытавым абслугоўванні, рамонце жылля, навядзенні парадку дома і ў двары.

Усе, хто мае патрэбу ў догляднасці, сацыяльных паслугах, ахоплены сацыяльным абслугоўваннем. Напрыклад, сацыяльнымі паслугамі дома (а гэта паслугі сацыяльных работнікаў на куплі лекаў, прадуктаў, прыборцы, прыгатаванні ежы і г. д., паслугі сядзелак) карыстаецца 1,9 тысячы ветэранаў і асоб, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. Ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання, якія ажыццяўляюць стацыянарнае сацыяльнае абслугоўванне, сацыяльную і медыцынскую дапамогу атрымліваюць 127 ветэранаў.

Акрама таго, за 493 ветэранамі дагладаюць іх члены сям'і і іншыя асобы, якім выплачваецца штомесячная дапамога па догляднасці ў памеры 100 % бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ). У гэтым годзе расходы на сацыяльнае абслугоўванне і дапамогу ветэранам і пацярпелым ад наступстваў вайны складуць каля васьмі мільёнаў рублёў.

САМЫЯ ЗАПАТРАБАВАНЫЯ — ПАСЛУГІ САЦЫЯЛЬНЫХ РАБОТНІКАЎ І СЯДЗЕЛАК ДОМА

— У існуючых дэмаграфічных умовах узрастае попыт на сацыяльныя паслугі. Якія з іх найбольш запатрабаваныя сёння і як яны будуць мяняцца?

— Сёння сацыяльныя паслугі шырокага спектра аказваюць 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, у кожным адміністрацыйным раёне ёсць такі цэнтр. Сістэму дапаўняюць 83 дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў. У сельскай мясцовасці даступнасць сацыяльных паслуг забяспечваюць 1168 сацыяльных пунктаў і 28 філіялаў.

Трэнды старэння насельніцтва, безумоўна, уплываюць на змену структуры атрымальнікаў сацыяльных паслуг. За апошнія тры гады колькасць непрацаздольных грамадзян і інвалідаў, якія атрымліваюць сацыяльныя паслугі, павялічылася на 6,2 % і дасягнула больш як 150 тысяч чалавек. Найбольшым попытам карыстаюцца сацыяльныя паслугі дома — гэта дапамога сацыяльных работнікаў і сядзелак. Імі сёння карыстаецца каля 100 тысяч чалавек.

Аднак сістэма ўвесь час развіваецца. Толькі летась мы ўвялі новыя паслугі: дзённы нагляд за асобамі з кагнітыўнымі парушэннямі, гуртковая праца для інвалідаў дома, навучанне членаў сям'і навыкам догляду непрацаздольных.

— Адной з новых форм догляду з'яўляецца замяшчальная сям'я. Наколькі запатрабаваная такая паслуга?

— Замяшчальная сям'я — форма сацыяльнага абслугоўвання адзінокіх інвалідаў I і II групы і пажылых грамадзян ва ўзросце, старэйшым за 70 гадоў, ва ўмовах сумеснага пражывання і вядзення агульнай гаспадаркі. Калі догляд у замяшчальнай сям'і аказваецца інвалідам I групы з розна выяўленымі парушэннямі, то памочніку выплачваецца ўзнагароджанне ў 100 % БПМ. Такая форма асабліва актуальная для сельскай мясцовасці, дзе адзінокіх пажылых шмат, а магчымасці па іх штодзённым абслугоўванні абмежаваны. Сёння ў 308 замяшчальных сем'ях пражываюць 312 чалавек сталага веку.

— Як ажыццяўляецца дапамога грамадзянам, якія маюць патрэбу ў кругласутачным догляду?

— Кругласутачны догляд арганізаваны ва ўмовах сацыянарных устаноў. Гэта дамы-інтэрнаты і аддзяленні кругласутачнага знаходжання ў цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання. Сёння дом-інтэрнат — шматфункцыянальная ўстанова, якая не абмежавана толькі арганізацыяй догляду і медыцынскай дапамогі. Гэта і рэабілітацыя, і вольны час, і падрыхтоўка інвалідаў да самастойнага жыцця за межамі інтэрната, і сацыяльная перадышка для сем'яў, дзе ёсць дзіця з інваліднасцю або пажылы чалавек. Каля 19 тысяч грамадзян сёння атрымліваюць паслугі ва ўмовах стацыянара.

Дзяржава таксама падтрымлівае асоб, якія самастойна дагледжваюць інвалідаў I групы або асоб, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту, праз выплату дапамогі па догляднасці. Такі нефармальны догляд атрымліваюць 29 тысяч грамадзян.

ШТО ПЛАНУЕЦЦА ЗМЯНІЦЬ?

— Сёлета плануецца ажыццявіць перагляд падыходаў да сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Што найперш плануецца змяніць?

— Клопат аб старэйшым пакаленні становіцца выклікам як для многіх сем'яў, так і ў цэлым для грамадства. У дэмаграфічі ёсць такі тэрмін, які ўведзены сацыяльнымі работнікамі, — «сіндром сэндвіч-пакалення». Гэтае пакаленне сярэдняга гадоў, «заціснутае» з двух бакоў абавязацельствамі: з аднаго боку — доглядам пажылых бацькоў, з другога — сваіх дзяцей, якія яшчэ не выраслі. І гэта ва ўмовах інтэнсіўных працоўных нагрузак і тэмпу жыцця, які імкліва паскараецца. Адкладванне мацярынства на пазнейшы ўзрост (а ў Беларусі сярэдні ўзрост пры нараджэнні дзіцяці ўжо наблізіўся да 30 гадоў) і старэнне насельніцтва будуць пагаршаць гэтыя працэсы.

Стратэгічна важна развіваць новыя формы сацыяльнага абслугоўвання, аблягчаючы гэтую нагрузку для сваякоў і адначасова захоўваючы хатняе асяроддзе для тых, хто ўжо не можа самастойна пра сябе клапаціцца. Падкрэслю, што пасяленне ў дом-інтэрнат павінна быць крайняй мерай, калі вычарпаны ўсе сродкі па арганізацыі догляду дома.

Важны крок у гэтым напрамку — змяненне падыходаў да вызначэння патрэбы ў сацыяльных паслугах. Аб'ём падтрымкі пажылых людзей і інвалідаў павінен адпавядаць іх фактычным запатрабаванням, на аснове прынцыпу «разам, а не замест». З гэтай мэтай плануецца ўвесці механізм ацэнкі патрэбы ў сацыяльным абслугоўванні — праз набор не толькі медыцынскіх, але і сацыяльных паказанняў.

Другі напрамак — замацаванне механізму падтрымкі асоб, якія ажыццяўляюць догляд пажылых і інвалідаў. Гэта выплата ўзнагароджання, навучанне навыкам догляду, псіхалагічная падтрымка, сацыяльная перадышка.

Трэцяе — перагляд падыходаў у арганізацыі дзейнасці стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання. Гэта спрашчэнне працэдуры пасялення, вызначэнне крытэрыяў камфортнасці пражывання, стварэнне гнуткай сістэмы аказання сацыяльных паслуг.

Акрама таго, у сувязі з ростам попыту рынак сацыяльных паслуг папаўняецца бізнес-сектарам. Пры гэтым бяспека грамадзян — наш агульны клопат. Таму плануецца фарміраваць рэестр пастаўшчыкоў сацыяльных паслуг, у які ўвойдуць камерцыйныя арганізацыі.

Усе гэтыя навацыі будуць улічаныя ў новым законапраекце.

ЗМЯНІЦЬ СТАЎЛЕННЕ ДА ЛЮДЗЕЙ «ЭЛЕГАНТНАГА ЎЗРОСТУ»

— Якія ящчэ меры плануюцца для змякчэння дэмаграфічнай сітуацыі? Якія напрамкі стратэгіі «Актыўнае даўгалецце» могуць у гэтым дапамагчы?

— Нацыянальная стратэгія «Актыўнае даўгалецце — 2030» — першы праграмны дакумент, які комплексна вызначае дзяржаўную палітыку ў інтарэсах пажылых грамадзян па розных напрамках. Вельмі важнымі з'яўляюцца пытанні стымулявання падаўжэння працоўнага жыцця і адаптацыі рынку працы да запатрабаванняў пажылых грамадзян. Гэта і магчымасць павысіць кваліфікацыю, атрымаць новую прафесію, адкрыць уласную справу.

Магчымасць навучання на працягу ўсяго жыцця, у тым ліку праз нефармальную адукацыю, — ящчэ адно звяно актыўнага даўгалецця. Сёння запатрабаваны адукацыйныя паслугі Універсітэта залатога ўзросту ў Гродне, Інстытута трэцяга ўзросту ў Брэсце, Мінскага ўніверсітэта трэцяга ўзросту, Кобрынскага ўніверсітэта залатога ўзросту.

У 2021 годзе запушчаны анлайн-універсітэт трэцяга ўзросту, які прапануе пажылым людзям 18 анлайн-курсаў. Самыя папулярныя сярод іх — «Школа здароўя», «Сакрэты перавасабленння», «Культурныя будні», «Фітнес для мозгу», «Падтрымка і догляд». Галоўная перавага новага праекта — магчымасць вучыцца з любога населенага пункта.

На базе Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі адкрыта перападрыхтоўка педагагічных работнікаў па спецыяльнасці «Адукацыя дарослых» з прысваеннем кваліфікацыі «Андрагог». Прафесія спецыяліста-андрагога прадугледжвае праекціроўку і рэалізацыю розных відаў адукацыйных праграм з улікам фізіялагічных, псіхалагічных і ўзроставых асаблівасцяў дарослых.

Для арганізацыі ўдзелу пажылых людзей у грамадскім жыцці свайго горада ці раёна пры выканкамах створана 140 саветаў пажылых грамадзян, якія аб'ядноўваюць больш як 1,3 тысячы актыўных людзей сталага веку. А валанцёрскія атрады «сярэбранага ўзросту» пры цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ўжо налічваюць больш за 2 тысячы чалавек.

Велізарную ролю адыгрываюць пытанні, звязаныя са здароўем. Ва ўстановах аховы здароўя арганізавана дзейнасць «Школ актыўнага даўгалецця». Узяты курс на стварэнне герыятрычнай службы. Дзейнічаюць Рэспубліканскі геранталагічны цэнтр і сем рэгіянальных герыятрычных цэнтраў.

Трэба сказаць, што нацыянальная стратэгія накіравана на ўсё насельніцтва нашай краіны, а не толькі на пажылых людзей, паколькі жыццёвы багаж, з якім мы ўваходзім у пажылы ўзрост, фарміруецца на працягу ўсяго жыцця.

Мінулы год — гэта толькі першы год рэалізацыі нацыянальнай стратэгіі. Задач і ідэй шмат. А самае галоўнае — важна змяніць стаўленне да старэйшага пакалення як да людзей «элегантнага ўзросту», у якіх ёсць вялікі патэнцыял дзякуючы іх жыццёваму вопыту і мудрасці. Як кажуць, разумны ведае, як выйсці з цяжкага становішча, у якое мудры ніколі не трапляе. І гэтая мудрасць мусіць быць запатрабавана грамадствам.

Алена КРАВЕЦ.

СІЛА ЗЯМЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіроўца Сяргей Парамонаў працуе ў «Альгоўскім» ужо 13 гадоў, усяго за плячыма шафёра 35 гадоў стажу. У залежнасці ад сезона заняты то на адвозцы збожжа, то, як сёння, гародніны. Адзначае, што працаваць камфортна, кіраўніцтва маральна і матэрыяльна падтрымлівае работнікаў, стварае бяспечныя ўмовы працы.

Пакуль гутарым з кіроўцам, на полі з'яўляецца блакітны МТЗ-82 з прычапной чатырохрадной бульбасаджалкай. Хутка загружае насенне і ўжо гатовы адправіцца да чорных прагрэтых разораў. За яго штурвалам — бульбавод Віктар Еранькоў, гэта яго 33-я пасяўная вясна. Сам Віктар Мітрафанавіч тутэйшы, з Бабініч. Пасля школы і Гарадоцкага сельскагаспадарчага вучылішча пачаў працоўны шлях у вучэбна-доследнай гаспадарцы «Падбярэззе», а пасля далучэння шмат гадоў працуе ў вытворчым кааператыве «Альгоўскае». Упартай працай, добрасумленным стаўленнем да справы заслужыў аўтарытэт у кіраўніцтва, павагу ў калег-механізатараў. Яго імя ўпрыгожвала Дошку гонару кааператыва, не раз механізатар быў адзначаны на раённым узроўні. Рабочы дзень яго пачынаецца ў шэсць гадзін раніцы, што для сельскага чалавека — справа звычайная. Пасля пасадкі бульбы спадар Еранькоў будзе заняты на міжрадной апрацоўцы, потым на нарыхтоўцы кармоў — прастойваць не прыйдзецца, толькі паспявай мяняць прычапныя агрэгаты. Заўважаю, што на полі ўсе з выдатным настроем, усміхаюцца і жартуюць — у гэтым заслуга дружнага калектыву.

Кіроўца вытворчага кааператыва «Альгоўскае» Сяргей ПАРАМОНАЎ.

— У сярэдзіне мая надвор'е злёгку сапсавала планы пасадкі, аднак мы разам распрабуем уключыся ў самыя кароткія тэрміны. Цалы дзень на полі, вялікі плюс, што гарачае харчаванне дастаўляюць проста сюды, абедаем, як той казаў, «не адрываючыся ад працэсу», — усміхаецца механізатар. — Галоўнае — працаваць сумленна, тады і справа ідзе спарней, і на душы лёгка.

У гаспадарках вобласці на канец мінулага тыдня было пасаджана звыш 200 гектараў капусты, морквы, буракоў і цыбулі. Гэта амаль 72 працэнты ад плана. Найбольшыя плантацыі гародніны засяродзіліся на палях «Рудакова» і «Альгоўскае» Віцебскага раёна, філіялаў «Цяплічны» Аршанскага і «Вясна-энерга» РУП «Віцебскэнерга» Полацкага раёна. Сяўбу морквы, капусты, буракоў на палях «Цяплічнага» правялі аператыўна за першыя два тыдні мая. Аграрыі Віцебскай вобласці плануюць завяршыць пасадку агародніны адкрытага грунту да 1 чэрвеня.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

Механізатар вытворчага кааператыва «Альгоўскае» Віктар ЕРАНЬКОЎ.

Блізкая ўлада

НА ПРЫЁМ ДА СЕНАТАРА

У чацвер, 26 мая, любы жыхар Віцебскай вобласці зможа асабіста звярнуцца да члена Савета Рэспублікі. У гэты дзень парламентарыі наведаюць усе раёны рэгіёна, сустрэнуцца з жыхарамі, выслухаюць просьбы, прапановы і скаргі і па магчымасці акажуць садзейнічанне ў вырашэнні хвалюючых пытанняў.

Традыцыйна людзей чакаюць у выканкамах:

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальна сходу Рэспублікі Беларусь **КАЧАНАВА Наталля Іванаўна** — з 11.00 у Віцебскім аблвыканкаме;

старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **СІВЕЦ Сяргей Міхайлавіч** — з 11.00 у Дубровенскім райвыканкаме;

старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах **РУНЕЦ Таццяна Аркадзьеўна** — з 11.00 у Навапалацкім гарвыканкаме;

старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч** — з 11.00 у Лепельскім райвыканкаме;

старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні **РУСЫ Міхаіл Іванавіч** — з 11.00 у Докшыцкім райвыканкаме;

старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **РАЧКОЎ Сяргей Анатольевіч** — з 11.00 у Новалукомльскім гарвыканкаме;

намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **БАСКАЎ Дзмітрый Юр'евіч** — з 11.00 у Лёзненскім райвыканкаме;

намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах **ДЗЯМІДАЎ Дзмітрый Уладзіміравіч** — з 10.00 да 12.00 у Расонскім і з 13.00 да 15.00 у Верхнядзвінскім райвыканкамах;

член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах **АНЮХОЎСКІ Сяргей Анатольевіч** — з 10.00 да 12.00 у Аршанскім і з 14.00 да 16.00 у Талачынскім райвыканкамах;

член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах **ЖЫНГЕЛЬ Алег Валянцінавіч** — з 10.00 да 12.00 ва Ушацкім і з 14.00 да 16.00 у Глыбоцкім райвыканкамах;

член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні **МАЦВЕЕЎ Уладзімір Сямёнавіч** — з 10.00 да 12.00 у Браслаўскім і з 13.00 да 15.00 у Мёрскім райвыканкамах;

член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні **ПАНЮХОВА Алена Валяр'янаўна** — з 11.00 да 13.00 у Сенненскім і з 14.00 да 16.00 у Бешанковіцкім райвыканкамах;

член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **СЕРАФІНОВІЧ Кацярына Адамаўна** — з 11.00 да 13.00 у Пастаўскім і з 15.00 да 17.00 у Шаркаўшчынскім райвыканкамах;

член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **ШЧАСНЫ Анатоль Тадэвушавіч** — з 10.00 да 11.00 у Шумілінскім і з 12.00 да 13.00 у Гарадоцкім райвыканкамах.

На прыём да сенатараў можна запісацца загадзя па тэлефонах, нумары якіх змешчаны на сайтах Савета Рэспублікі і названых райвыканкамаў.

Надвор'е

ХАЛАДНАВАТА — ТЭМПЕРАТУРА Ў МАІ НІЖЭЙ ЗА НОРМУ

У пачатку тыдня прыгрэе досыць грунтоўна, але потым халодны дождж і вецер не прынясуць нам камфорту, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Як аказалася, другая дэкада месяца стала больш шчодрая на ападкі, чым першая. А з цяплом нам наогул не пашанцавала — сярэднясутачныя тэмпературы павятра ў другой дэкадзе мая вагаліся ад плюс 10 па поўначы да плюс 15 па паўднёвым захадзе краіны, што ў асноўным ніжэй за кліматычную норму на 1–2 градусы. У аўторак і сераду мы будзем без дажджоў. Максімальная тэмпература павятра сёння будзе вагацца ад 18 градусаў да 24 цяпла.

Удзень у сераду па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, а месцамі магчымыя навальніцы. Тэмпература павятра ўначы будзе плюс 4–10 градусаў, а па паўднёвым захадзе — да 12 цяпла. Удзень тэмпература павятра складзе плюс 19–24 градусы, а па поўдні да 26 градусаў вышэй за нуль.

Тэмпература пачне мяняцца ўжо ў чацвер. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі будуць навальніцы, а ўдзень узмацненне ветру парывамі да 15–20 м/с. Тэмпература павятра ноччу будзе вагацца ад плюс 8 да 14 градусаў, а ўдзень чакаецца 16–23 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у канцы тыдня ў Беларусі захаваецца дажджлівае надвор'е з тэмпературным фонам на 3–6 градусаў ніжэй за кліматычную норму. У пятніцу ўначы месцамі, удзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература павятра ноччу складзе плюс 5–12 градусаў, а днём павятра прагрэецца да 13–20 цяпла.

Будзе часам дажджліва і ў суботу. У гэты дзень у асобных раёнах нашай краіны чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15–18 м/с. Тэмпература павятра ўначы будзе вагацца ад плюс 5 градусаў да 12 цяпла, а ўдзень ад плюс 10 да 17 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Уладзіміру Мікалаевічу Чушаву, былому Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ЖОНКІ.

«ВЫТОКІ» ДАКАЗАЛІ, ШТО РОДНАЕ — САМАЕ МОДНАЕ

Чарговы этап фестывалю прайшоў на Гомельшчыне

Яркаму лету — быць. Другі сезон культурна-спартыўнага фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу» стартаваў у мінулыя выхадныя. Першай свята прыняла Гомельшчына, а дакладней, старажытная і цікавая Рэчыца. Фестываль аб'яднаў насычанае мінулае гэтага горада і яго актыўнае сённяшняе.

Каб лепей адчуць каларыт Рэчыцы, варта пазнаёміцца з яго гісторыка-культурнай спадчынай. Менавіта з гэтай мэтай быў арганізаваны прэс-тур для прадстаўнікоў рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ, а таксама для арганізатараў фестывалю. У мясцовым краязнаўчым музеі мы змаглі адчуць сябе сапраўднымі археолагамі. Супрацоўнікі музея правялі майстар-клас па гэтай, як аказалася, нялростай справе. Тэма абрана невыпадкова. Адзін з брэндаў рэгіёна — мілагардская археалагічная культура, якая датуецца VII—I стст. да нашай эры. На тэрыторыі Рэчыцкага раёна знойдзена мноства артэфактаў тых часоў. І хоць годам заснавання Рэчыцы лічыцца 1213, гісторыкі мяркуюць, што людзі тут жылі яшчэ ў VIII стагоддзі. Дакладна вядома, што праз старажытную Рэчыцу праходзіў буйны гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі». Таму гэтая зямля можа многае расказаць пра падзеі мінулага, толькі варта навучыцца яе разумець.

Удзельнікі прэс-тура пабачылі і адну з самых знакамітых славутасцяў Рэчыцы — капліцу святой Ефрасіні Полацкай. Гэта не проста помнік, а вельмі знакавы для горада аб'ект. Менавіта ў гэтым месцы ў 1910 годзе быў вялікі прыпынак параходаў, якія везлі мошчы прападобнай Ефрасінні з Кіева ў Полацк. У знак святасці гэтага месца жыхары ўсталявалі дубовы крыж, які пасля замяніла капліца. Увогуле, гэтая капліца адлюстроўвае сабой усю беларускую гісторыю. Яна была адкрытая ў 1995 годзе. Гэта было прысвечана 1000-годдзю хрышчэння Русі, 50-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, подзвігу воінаў-інтэрнацыяналістаў і ахвярам чарнобыльскай катастрофы. Чатыры апоры 24-метровай капліцы сімвалізуюць развіццё жыцця і думкі па спіралі. На іх упісаны лікі 12 беларускіх святых і асветнікаў: епіскапаў Полацкіх Міны і Дзіянісія, Кірылы Тураўскага, Елісея Лаўрышаўскага, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Сімяона Полацкага, Льва Сапегі, Гаўрылы Беластоцкага, Францыска Скарыны, Івана Фёдарава. Вянчае кампазіцыю крыж Ефрасінні Полацкай. Помнік стаіць на скрыжаванні вуліц Набярэжнай з Чапаева на высокім беразе Дняпра. Месца надзвычай маляўнічае.

Каб адчуць разнастайнасць рэчыцкіх славутасцяў і задаволіць гасцей горада з розным густам, варта ўключыць у сваё падарожжа Музей цвіка. Адзіны ў Беларусі падобны музей знаходзіцца на тэрыторыі Рэчыцкага метызнага завода. Гэта найбуйнейшае ў краіне падобнае прадпрыемства. А заснаваны завод аж у 1912 годзе братамі Барысам і Уладзімірам Рыкамі. У экспазіцыі Музея цвіка прадстаўлены першыя металічныя вырабы, якія выпусціў завод. Такім чынам, на прыкладзе звычайнага цвіка можна прасачыць, як мянялася жыццё, удасканальваліся тэхналогіі. Аматарам вытворчага турызму будзе цікава наведаць такую экскурсію і паглядзець, як чалавек падпарадкоўвае сабе метал.

Ва ўсёй прыгажосці рэчыцкую гасцінасць удзельнікі прэс-тура змаглі адчуць у агрэсядзібе Велес, што недалёка ад горада. Тут і прырода, і смачная беларуская кухня, і міні-заапарк. А клуб гістарычнага фехтавання і рэканструкцыі Terra паказаў гасцям сапраўдную, «жывую» гісторыю. Дарэчы, гэта найстарэйшы падобны клуб у Беларусі: заснаваны ў 1993 годзе.

АД СПОРТУ ДА МАСТАЦТВА...

Адпачынак адпачынкам, але абмеркаваць надзённыя пытанні таксама трэба. Паколькі «Вытокі» яшчэ і спартыўны фестываль, семінар «Актуальныя пытанні падрыхтоўкі спартсменаў і шляхі іх вырашэння» стаў важным пунктам у праграме фестывалю. «Не кожная вобласць можа пахваліцца такой матэрыяльна-тэхнічнай базай, але праблем хапае. Найважнейшым напрамкам галіны па-ранейшаму застаецца дзіцячы спорт», — адзначыў **Павел СТАРАСВЕЦКІ, начальнік упраўлення спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама.**

Спецыялісты абмеркавалі якасць падрыхтоўкі спартсменаў, вучэбныя праграмы, арганізацыю трэніровачнага працэсу і іншыя важныя спартыўныя пытанні. А прадстаўнікі Беларускай алімпійскай акадэміі правялі семінар-практыкум па алімпійскай адукацыі.

Традыцыйна фестываль «Вытокі» прапануўвае нешта цікавае і аматарам мастацтва. Сёлета мастацкая галерэя «АртХаос» правяла майстар-клас па набойцы маляваных дываноў, унікальным беларускім рамястве. «Вытокі — тое, на чым заснавана наша жыццё. Таму сёлета мы вырашылі правесці майстар-клас па нашым самабытным, народным багацці. Маляваныя дываны ўключаны ў Спіс дзяржаўных гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Мне здаецца, апошнім часам узнікае попыт на старое, самабытнае, наша — беларускае. І мы падумалі, што майстар-клас — аптымальны варыянт. Калі сам удзельнічаеш у творчым працэсе, усё лепей запаміноецца і застаюцца больш яркія ўражанні», — расказала **дырэктар мастацкай галерэі «АртХаос» Лілія ЛУКАШЭНКА.**

Акрамя майстар-класа, супрацоўнікі галерэі арганізавалі выстаўку маляваных дываноў. Прадстаўлі работы як сучасных майстроў, так і рэпрадукцыі майстроў старэйшага пакалення, самы вядомы з якіх — Язэп Драздовіч.

У Рэчыцы на майстар-клас запісалася столькі ахвотных, што іх прыйшлося дзяліць на дзве групы. Спачатку маляваныя дываны набівалі дзеці, затым — дарослыя. Кожная група зрабіла агульны дыван, а затым удзельнікі зрабілі па невялікай сурвэтцы. Лілія Лукашэнка адзначыла, што гэта стане добрым сувенірам і напамінам пра фестываль «Вытокі». Да майстар-класа па набойцы маляваных дываноў далучыўся і **алімпійскі чэмпіён па кулявой стральбе Сяргей МАРТЫНАЎ.** «Цікавы майстар-клас, галоўнае — дзецям спадабалася. Любы від творчай дзейнасці карысны, і калі атрымліваецца — трэба займацца. Даўно не быў на такіх мерапрыемствах», — падзяліўся ён. Скончыўся першы дзень фестывалю традыцыйна — канцэртам арганнай музыкі ў выкананні Валерыя Шмата.

...І ЗНОЎ ДА СПОРТУ

Аб родных мясцінах і палешуках «са знакам якасці»

— Вы нарадзіліся ў Нараўлянскім раёне, але практычна ўсё жыццё працуеце ў Мазыры. Які раён для вас цяпер раднейшы?

— Так, нарадзілася я ў Нараўлянскім раёне, але ў 1997 годзе ў сувязі з чарнобыльскай трагедыяй нашай сям'і давялося пераехаць у Мазырскі раён. Практычна ўся мая працоўная дзейнасць звязана з Мазыршчынай. Калі б не здарылася чарнобыльская трагедыя, я не змяліла б месца жыхарства і засталася б працаваць у сваім любімым населеным пункце — Кіраве. Мазыр і Нароўля побач, і ўжо восем гадоў сельская гаспадарка Нараўлянскага раёна знаходзіцца ў камунальнай уласнасці Мазыра. Мы імкнёмся максімальна эфектыўна вырошчваць там сельгаскультуры і атрымліваць якасную прадукцыю, якая адпавядае ўсім нормам бяспекі. Напэўна, цяпер у большай ступені родныя мясцінамі я лічу Мазырскі раён, бо тут жыву і працую ўжо чвэрць стагоддзя.

— Вы пачыналі працоўны шлях у аграпрамысловым комплексе. Хто вам бліжэй: сельскія жыхары ці гараджане?

— На вёсцы людзі вельмі адказна ставяцца да сваёй зямлі. Мне здаецца, яны дабрэйшыя ў адносінах адно да аднаго, чым гараджане. Заўсёды імкнуцца дапамагчы і падтрымаць. Сем'і там таксама мацнейшыя. Нездарма ж кажуць, што ўсё пазнаецца ў працы. А ў цэлым (я заўсёды гэта падкрэсліваю), палешукі (і гараджане, і вяскоўцы) — людзі асаблівыя. Быццам «са знакам якасці» — адказныя, добразычлівыя, стрыманыя, працавітыя. Адна з найважнейшых задач маёй дзейнасці — стварэнне ўмоў для працы і пражывання моладзі. Імкнуся, каб маладыя людзі не пакідалі родных мясцін, каб стваралі тут сем'і і нараджалі дзяцей. І пакуль гэта ўдаецца: Мазыршчына — рэгіён малады, сярэдні ўзрост жыхароў — 32 гады. Таму вялікая ўвага — сацыяльнай сферы. Летась быў уведзены ў эксплуатацыю дзіцячы сад на 330 месцаў. Зараз вядзецца рэканструкцыя яшчэ аднаго аб'екта пад дашкольную ўстанову на 280 месцаў. Будуем аранжавае жыллё. Стараемся, каб найлепшыя выпускнікі нашых датычыцца кіраўніцтва рэгіёнам, тут вельмі патрэбны якасці, якія ўласцівыя жанчынам: шматзадачнасць, адказнасць, уважлівасць, дэталёвасць, камунікатыўнасць. Калі існуюць даверлівыя адносіны з кіраўнікамі предпрыемстваў, прасцей дапрацоўваць вызначаную перспектыву і ўвасабляць яе ў рэальную практыку. Наш раён увайшоў у праграму паскоранага развіцця рэгіёнаў з колькасцю насельніцтва 80 тысяч чалавек і больш. Мы мэтанакіравана, дасканала адпрацавалі праграму развіцця рэгіёна і кожнага прадпрыемства паасобку. Дзякуючы гэтаму павялічылася выручка прадпрыемстваў і арганізацый, прыйшлі інвестыцыі. Пабудаваны новыя аб'екты, з'явіліся новыя вытворчасці. Напрыклад, самы буйны ў Беларусі пелетны завод — Мазырская доследная лясгаса. І як вынік — наш раён занесены на абласную і рэспубліканскую Дошку гонару. Што датычыцца звання «Жанчына года», то гэта не асабіста мая заслуга, а заслуга нашых людзей, агульны вынік нашага рэгіёна.

Фота Алены ДАЎКАНОК.

Аб званнях і адказнасці

— У 2019 годзе вы сталі «Жанчынай года» ў намінацыі «Паспяховы кіраўнік». Звычайна на ролю кіраўніка прамысловага рэгіёна прынята прызначаць мужчын. Але ў сучасным свеце вельмі многае трымаецца на жанчынах — і ў Мазырскім раёне таксама?

— Сапраўды, Мазыршчына — прамысловы рэгіён: 42,9 % аб'ёму прамысловай вытворчасці Гомельскай вобласці вырабляецца ў нас. У прамысловым сектары (машынабудаванні, нафтаперапрацоўцы, вытворчасці кухоннай солі) пастаянна працуюць мужчынскія рукі. Але, што **— За якую колькасць людзей вы несяце адказнасць?**

— Паводле апошняга перапісу населніцтва, у раёне пражывае 128 тысяч чалавек. Але, як мы бачым па тых жа ганднёвых заяўках, на факце пражывае больш — каля 135 тысяч. Напрыклад, многія маладыя спецыялісты забралі сваіх пажылых бацькоў, і яны цяпер таксама жывуць у Мазыры або раёне. Асабіста ведаю вельмі многіх мазыран, бо жыву тут практычна ўсё жыццё, выгадавала тут дзяцей. У гэтым плюс. Мы разам працуем на агульны вынік. Калі ведаеш людзей, разумееш, каму трэба дакладна паставіць задачу адзін раз, а каму нагадаць некалькі разоў ...

— Існуе практыка прысваення звання «Ганаровы жыхар Мазырскага раёна». Для таго, каб ім стаць, трэба нарадзіцца на Мазыршчыне?

— Неабавязкова. Але трэба тут жыць не менш чым 20 гадоў і працаваць на карысць рэгіёна. У гэтым годзе ў нас такіх людзей сем. Гэта Аляксей Валянцінавіч Баруноў, выкладчык IT-дысцыплін. Яго выхаванцы — пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд. Гэта Аляксандр Аляксандравіч Собалеў, генеральны дырэктар Мазырскага домабудаўнічага камбіната. Больш за 80 % новых дамоў у Мазыры пабудаваны пад яго кіраўніцтвам. Гэта нашы байдарачнікі — Марына Літвінчук, Віктарыя Махнева, Надзея Папок і Вольга Худзенка, сярэбраныя прызёры Алімпіяды ў Токіа. А таксама іх трэнер — Генадзь Мікалаевіч Галіцкі. «Ганаровы жыхар» — адказнае званне. На гэтых людзей павінны раўняцца ўсе.

Аб выніках і планах

— Па адукацыі вы эканаміст і добра ведаеце эканамічны патэнцыял раёна. Якія мэты ставіце?

— Сёння сярэдняя зарплата на раёне за сакавік склала 1483 рубля 90 капеек. Хацелася б, каб яна перавысіла 1,5 тысячы рублёў. Бюджэтнікам мы павялічваем аплату ў рамках пастановы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — такія павышэнні прайшлі 1 красавіка і 1 мая. Удзяляем увагу пытанням атрымання больш высокіх кваліфікацый. Гэта станоўча ўплывае і на зарплату, і на якасць працы. І, вядома, значную ролю тут адыгрывае павышэнне тарыфных ставак 1 разраду на нашых прадпрыемствах і ў арганізацыях, якія маюць рост выручкі і прадукцыйнасці працы. Калі прадпрыемства эфектыўна працуе з прыбыткам, мы павышаем тарыфную стаўку, і, адпаведна, расце ўзровень аплаты. Высокія зарплаты ў рэгіёне сапраўды заробленыя. Па выніках першага квартала гэтага года ўдзельная вага выручкі нашага раёна ў вобласці склала больш чым 29 % (у мінулым годзе за той жа перыяд гэты паказчык быў на ўзроўні 28 %).

— А калі гаварыць аб планах больш шырока?

— Да 2025 года мы павінны павялічыць аб'ёмы вытворчасці ў паўтара раза, як і выручку. А гэта значыць, што ад мінімум на 10 % мы павінны прырасці. Да гэтага імкнёмся. Па статыстыцы двух месяцаў 2022 года выручка склала 136 % да ўзроўню адпаведнага перыяду папярэдняга года. Як вынік — з'яўляецца магчымасць інвеставаць у тэхнічнае перааснашчэнне прадпрыемстваў, рэканструкцыю, новае будаўніцтва і, адпаведна, павышаць аплату працы.

— Як вы ацэньваеце работу аграпрамысловага комплексу рэгіёна ў гэтым годзе?

— Стабільнасць кадраў і тэхнічнае абсталяванне дазваляюць правадзіць палявыя работы ў тэхналагічныя тэрміны пры любых умовах надвор'я. Сяўба збожжавых у нас праведзена ў дзесяцідзённы тэрмін. Што да асноўнай нашай культуры, кукурузы (на зерне, насенне і сілас), мы завяршаем сяўбу да 20 мая. У прадпрыемстваў АПК ёсць трактарны парк, поўнае забеспячэнне мінеральнымі і арганічнымі ўгнаеннямі. Нельга падмануць зямлю, як нельга падмануць і сельскагаспадарчых жывёл. Калі парушышь тэхналогію — выніку не будзе. Тэхналагічныя рэгламенты для таго і адпрацаваны навыкай і зацверджаны Міністэрствам сельскай гаспадаркі, каб рэалізоўваць іх на месцах. Калі тэхналогіі дакладна выконваюцца, будзе і належная кармавая база, і ўраджайнасць.

— Што найбольш важна для паспяховага кіраўніка?

— Галоўнае, каб чалавек не хлусіў сам сабе. Думаю, гэта важна не толькі для кіраўнікоў, але і для кожнага, чым бы ён ні займаўся ў жыцці. Усё проста: у кожнага з нас ёсць службовыя і чалавечыя абавязкі, і калі выконваць іх добрасумленна, усё ў жыцці атрымаецца. І яшчэ, лічу, любых вяршынь можна дасягнуць, толькі працуючы ў камандзе. Калі каманда будзе добра працаваць, тады будзе і вынік.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Дабрабыт

ПАГУЛЯЕМ ПА «БУЛЬВАРЫ»

Сучасны гандлёвы цэнтр — гэта не проста крамы, а свайго роду lifestyle-прастора, дзе шопінг, мода, кава і прысмакі, забаўляльныя мерапрыемствы і прэзентацыі становяцца падставай для сустрэч, магчымасцю адпачыць і ўзняць настрой сабе і сваёй сям'і. Менавіта гэта — канцэпцыя самага новага гандлёвага цэнтра Мазыра.

У Мазырскім раёне на сёння налічваецца больш за 1700 аб'ектаў гандлю, адзначае **старшыня Мазырскага райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА.**

— Толькі за тры месяцы 2022 года адкрыты 54 новыя гандлёвыя аб'екты. У прыватнасці, 8 красавіка ў Мазыры адчыніў дзверы для наведвальнікаў новы гандлёва-выставачны цэнтр «Бульвар».

Сучасных гандлёвых цэнтраў у Мазыры нямала: «Бабруйскі», «Катапульта», «Малінінскі», «Глобал», «Башня», «Інтэрплаза»... У новым вырашана зрабіць акцэнт на прадукцыю мясцовых вытворцаў. Ужо відавочна: гэты фармат знайшоў водгук у гараджан.

«Бульвар» — сучасны гандлёвы аб'ект. На плошчы больш чым 10 тысяч квадратных метраў размясціліся як вядомыя айчынныя і міжнародныя гандлёвыя брэнды («Міла», «Мегатоп», «7 карат», «Славія», «Доктар Вет», «Sinsay», «Panda», «Oz»), так і прадукцыя мясцовых вытворцаў. Увазе наведвальнікаў — крамы адзення, абутку, аксесуараў, ёсць салон сотавай сувязі «МТС» і кафэ, якое ўжо завявала папулярнасць у мазыран. Да плюсаў цэнтра можна аднесці і вялікую паркоўку.

Гандлёвы цэнтр пабудаваны па праекце ТАА «Аграінгандль», які вядомы ў Мазыры дзякуючы шыроказ гандлёвай сеткі «Смак», а таксама ўласнай вытворчасці хлебабулачных, кандытарскіх і іншых вырабаў. Як растлумачылі ў ТАА «Аграінгандль», крама «Смак» у ГЦ «Бульвар» прапануе наведвальнікам у тым ліку і фермерскую прадукцыю — свежую, экалагічна чыстую і вельмі смачную. Так што і гасцям горада будзе цікава наведаць прадуктовую секцыю новага гандлёва-выставачнага цэнтра: тут можна паспрабаваць тое, чаго вы не знойдзеце на прылаўках у іншых гарадах краіны.

Фота Алены ДАЎКАНОК.

Назва цэнтра абрана невыпадкова — «Бульвар» размешчаны на скрыжаванні двух бульвараў, Малініна і Юнацтва. У ТАА «Аграінгандль» падкрэслілі, што новы ГЦ знаходзіцца ў адным з густанаселеных і ў самым маладзёжным раёне Мазыра. Таму ўвага аддадзена шматфункцыянальнасці: напрыклад, з надыходам лета тут будзе ладзіцца мноства дзіцячых забаўляльных мерапрыемстваў.

УНП 400036117

Нацыянальная мужчынская каманда Рэспублікі Беларусь па веславанні на байдарках разам з трэнерам Уладзімірам ШАНТАРОВІЧАМ.

КАЛІ СПРАВА ІДЗЕ СПОРНА

Саўгас-камбінат «Зара» — адна з флагманскіх арганізацый агрпрамысловага комплексу Беларусі, яскравы прыклад паспяховага развіцця буйнога сельскагаспадарчага прадпрыемства.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Шматпрофільны гігант «Зара» — гэта тысячы гектараў зямлі і сельскагаспадарчыя аб'екты на тэрыторыі двух раёнаў, Мозырскага і Нараўлянскага. У актыве «Зары» — багатая на дасягненні гісторыя і ўласныя традыцыі. У жніўні мінулага года саўгас-камбінат перасягнуў 25-гадовую мяжу, і больш за палову гэтых гадоў на праве займае месца на рэспубліканскай Дошцы гонару.

Асноўны напрамак дзейнасці «Зары» — жывёлагадоўля, вядучая галіна якой — свінаводства. Пагалоўе свіней налічвае сёння 54 529 галоў высокапрадукцыйных мясных парод Ёркшыр, Ландрас і Дзюрок, распавядае **галоўны заатэхнік ДП «Саўгас-камбінат «Зара» Алена ПІНЧУК**. Да ўзроўню мінулага года іх колькасць павялічылася на 469 галоў.

— Штодня здаём на забой 200-250 жывёлін сярэдняй вагой 125-129 кг кожная, — кажа спецыяліст.

Ёсць на прадпрыемстве і свае перапрацоўчыя цэхі — свініну ад «Зары» даўно ацаніў спажывец па ўсёй Гомельскай вобласці.

Птушкафабрыка — яшчэ адзін кірунак работы, дзе дасягнуты высокія вынікі і пры гэтым маецца патэнцыял росту і развіцця. Сёння пагалоўе курэй-нясушак складае 223 575 галоў, яйцаноскасць на курыцу — 323 яйкі. У фірменнай сеткі крам ДП «Зара» налічваецца больш за 200 відаў прадукцыі: тут ёсць і разабраная птушка, і вэнджаная грудзінка, і курыца грыль — адным словам, прадукцыя на любы густ.

— Ёсць у нас і статак (13 229 галавы), дзе курачкі ўтрымліваюцца разам з пеўнямі, — адзначае галоўны заатэхнік. — Калі раней сутачных куранят мы закуплялі, то сёння самі вырабляем інкубатарнае яйка. Такое падраздзяленне на прадпрыемстве з'явілася летась.

З алподнага яйка, дадае спецыяліст, праз тры тыдні прадпрыемства атрымлівае куранят-бройлер. За 2021 год у інкубатар пакладзена 1 098 400 яек. Лішак — 2 мільёны 135 тысяч інкубатарных яек — птушкафабрыка прадала: алподненае яйка карыстаецца вялікім попытам.

«Нашы курачкі нясуць залатыя яечкі», — жартуюць супрацоўнікі птушкафабрыкі.

Значны ўклад у эканамічны дабрабыт прадпрыемства ўносіць і мяса-малочная жывёлагадоўля. Пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў «Зары» — больш за 8 тысяч жывёлін, дойны статак — 2121 галава. Па выніках 2021 года ў нараўнанні з 2020-м прырост статка склаў 171 жывёліну. Сярэдні надой на карову на фермах Мазыркага раёна — 9,8 тысячы літраў, каля 8,7 тысячы літраў атрымліваюць МТФ «Зары», размешчаныя ў Нараўлянскім раёне. Усё малако здаецца на перапрацоўчае прадпрыемства гатункам экстра, а яго тлустасць складае 3,9-4,1 %.

— Дасягненні нашага прадпрыемства — гэта добрасумленная праца кожнага работніка. У сельскай гаспадаркі не бывае выпадковых людзей, яны тут не затрымліваюцца, — кажа Алена Канстанцінаўна. — І, вядома, гэта вынік работы вопытнага кіраўніка, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Алега Міхайлавіча Слінько. «Зары» шмат гадоў шанцавала з кіраўнікамі. Такія дырэктары, як Алег Міхайлавіч Слінько і раней шы кіраўнік саўгаса-камбіната «Зара» Уладзімір Андрэевіч Дворнік, сапраўды здольныя і вывесці прадпрыемства на лідарскія пазіцыі, і натхніць калектыў на працоўныя здзяйсненні.

Фота з архіва прадпрыемства.

УНП 400408726

КУЗНЯ ЧЭМПІЁНАЎ

Мазырская СДЮШАР прафсаюзаў па веславанні на байдарках і каноэ з'явілася на карце і ў гісторыі Мазыршчыны 1 студзеня 1974 года. У той далёкі час не было сучасных спартыўных баз, якія ёсць у распараджэнні весляроў сёння. А вось выдатныя трэнеры ў Мазырскай СДЮШАР ужо былі, і менавіта ім абавязканьа сваімі высокімі дасягненнямі мазырскія спартсмены.

Трэніроўка на вадзе.

Калі ў сярэдзіне 70-х трэнерскі цэх школы папоўніўся маладымі трэнерамі Уладзімірам Шантаровічам і Віталіём Скрыганавым, пачалася новая эпоха ў развіцці мазырскага веславання на байдарках і каноэ. Сёння тут працуюць адны з найлепшых трэнераў Беларусі ў веславанні, распавяла **начальнік аддзела спорту і турызму Мазырскага райвыканкама Галіна КАСЦЯШКІНА.**

— Веславанне як спартыўны кірунак выклікае ў Мазыры павышаную цікавасць у бацькоў, дзяцей і падлеткаў, — адзначае яна. — Напэўна, таму што ва ўсіх на слыху нашы трыумфатары — сярэбраныя прызёры Алімпійскіх гульняў у Токіа Вольга Худзенка, Марына Літвінчук, Маргарыта Махнева і Надзея Папок. Або Раман Петрушэнка, алімпійскі чэмпіён і сямікразовы чэмпіён свету. За гады свайго існавання СДЮШАР выхавала цэлую плеяду выдатных спартсменаў: гуляючы па Мазыры, можна сустрэць алімпійскага чэмпіёна. І яны служаць добрым арыенцірам для падрастаючага пакалення.

Цяпер на базе школы трэніруецца мужчынская нацыянальная зборная па веславанні на байдарках і каноэ. А трэніруе іх ужо мясцовая легенда — выдатны настаўнік Уладзімір Шантаровіч.

— Спорт вышэйшых дасягненняў — сэнс жыцця спартсменаў. Гэта як вера, — тлумачыць ён. — Спачатку трэба, каб у спартсменаў паверыў той, хто іх вядзе, трэнер. А далей яны самі пачынаюць верыць у сябе — і дасягаюць выдатных вынікаў. Таму што жывуць гэтым відам спорту. У нас касмічныя вынікі — на чэмпіянатах Еўропы, свету, Алімпійскіх гульнях. Толькі за апошнія 8 гадоў — 10 чэмпіёнаў свету па веславанні родам з Мазыра і выхадцы з нашай школы.

Калі хтосьці не стаў чэмпіёнам, гэта недапрацоўка трэнера, мяркуе Уладзімір Уладзіміравіч. Калі малады чалавек не застаўся ў спорце, кінуў займацца — значыць, настаўнік нешта да спартсмена не данёс, не здолеў знайсці правільны падыход да вучня.

Сёння ў Мазырскай СДЮШАР прафсаюзаў па веславанні на байдарках і каноэ 270 юных спартсменаў. Прымаюць сюды з сямі гадоў. І самым галоўным у рабоце з дзецьмі Уладзімір Шантаровіч лічыць нават не вынікі і дасягненні. «Сыходзяць шкодныя звычкі, менш часу дзеці праводзяць, утаропіўшыся ў смартфон. Яны становяцца здаравейшыя і пачынаюць лепш вучыцца», — падкрэслівае ён.

— Пяцьдзясят гадоў я раношу трэнерам. На маіх вачах змяняюцца пакаленні. І я не магу чуць, калі кажуць: «Цяпер дзеці не тыя» або «У наш час моладзь была лепшая». Напраўду! І дзеці, і моладзь ад пакалення да пакалення становяцца больш цікаўныя, мэтанакіраваныя, працаздольныя. Усё залежыць ад педагога. Бо першапачаткова і дзіця, і падлетак прыходзіць не ў від спорту, а да трэнера. І ад трэнера залежыць, ці паверыць вучань у сябе настолькі, каб здолець стаць чэмпіёнам.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

ДАРАЖЭЙ, ЧЫМ ЗОЛАТА

У КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная», адной з найлепшых гаспадарак краіны па вытворчасці мяса і малака, «залатым фондам» лічаць прафесіяналаў

Рэнтабельная мясная вытворчасць, рэкордныя надоі і лідарскія пазіцыі ў раслінаводстве, акцэнт на сацыяльную сферу і высокая нават на сталічных мерках сярэдняя зарплата, мадэрнізацыя за кошт уласных сродкаў і свае кармы для вялізнага, амаль 8,5 тысячы галоў, статка... У «Крынічнай» аб цякучцы кадраў гаворкі не ідзе — наадварот, гаспадарка можа сабе дазволіць выбіраць супрацоўнікаў. І менавіта прафесіяналізм і згуртаванасць калектыву, па словах кіраўніка Мікалая РУБАХІ, — залог эканамічнага поспеху прадпрыемства.

Напрамкі дзейнасці эксперыментальнай базы — жывёлагадоўля, высокатэхналагічнае сучаснае раслінаводства, вытворчасць прадукцыі кукурузакалібровачнага завода. За апошнія гады «Крынічная» пабудавала тры сучасныя жывёлагадоўчыя комплексы на 600 галоў кожны, на 70 % абнавіла машынна-трактарны парк, мадэрнізавала кукурузакалібровачны цэх — а гэта адзіная ў сваім родзе ў Гомельскай вобласці, унікальная вытворчасць.

— Мы вырошчваем элітныя сарты зернебабовых культур, бульбы, бацькоўскія формы кукурузы, — расказвае **намеснік дырэктара па ідзалагічнай рабоце Аксана ГРЫБ.** — Забяспечваем імпартазамяшчэнне элітнага насення.

Сучасныя малочнатаварныя комплексы і якасныя кармы дазволілі гаспадарцы стаць адной з найлепшых у краіне па вытворчасці мяса і малака. «Крынічная» — адзіны комплекс у краіне, дзе вырошчваюцца сіменталы — высокапрадукцыйная мяса-малочная парода з тлустасцю малака парадку 4 %. Таксама тут утрымліваецца галштына-фрызская малочная парода буйной рагатай жывёлы. Дойны статак у гаспадарцы — 2464 каровы плюс жывёлы на адкорме. Агульная колькасць статка — 8402 галавы.

— Па вытворчасці малака за 2021 год мы занялі 1-е месца ў Гомельскай вобласці, — адзначае суразмоўніца.

Мяжу ў 8 тысяч кілаграмаў па надоі ад каровы тут ужо пераадолелі. Прычым больш за 70 % малака здаецца гатункам «экстра», астатняе — найвышэйшым.

— Штодня на гармалзавод здаём 64 тоны малака, — дадае Аксана Ігараўна і яшчэ раз падкрэслівае: высакакласныя спецыялісты — залог поспеху ў любой галіне, але асабліва яны важныя ў аграрным сектары.

Намеснік дырэктара па ідзалагічнай рабоце Аксана ГРЫБ дэманструе ўзнагароды прадпрыемства.

Сяўба кукурузы.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Трактарыст-машыніст Мікалай ЛІСОЎСКІ падчас сяўбы кукурузы.

Пачатак працоўнай дынастыі

Гэтай вясной надвор'е падвяло, і ўсё ж сяўбу збожжавых гаспадарка завяршыла да 9 мая. Накіроўваемся ў поле, дзе **трактарыст-машыніст Мікалай ЛІСОЎСКІ** заняты на сяўбе кукурузы. Пра яго кіраўніцтва кажа, што няма такой працы на трактары або камбайне, у якой ён не майстар.

— Працую ў «Крынічнай» з 2006 года, — распавядае ён. — Сястра жонкі запрасіла нас у госці, мы прыехалі, пазнаёміліся з гаспадаркай і вырашылі застацца тут жыць і працаваць. Калектыў, рацыянаізацыя працы, стаўленне да людзей — усё на вышыні! І тэхніка добрая. Тэхнічны парк абнаўляецца кожны год. Сёлета закупілі яшчэ 6 тракгароў, 2 новыя МАЗы. Але я свой трактар не прамяняю ні на які іншы.

Суразмоўца кажа: машына і механізатар паступова становяцца «адным цэлым».

— Прывык, ведаю ўсе непаладкі. Яны рэдка бываюць, але ўсё ж лепш дасканала вывучыць характар машыны. Бо ў пасяўную, напрыклад, я з шасці раніцы ўжо ў полі, а дома — толькі ў 9-10 вечара. Гэтай вясной дажджы трошкі перашкодзілі, пасяўная зацягнулася, цяпер спяшаемся нагнаць упушчанае.

Дарэчы, Лісоўскія — гэта ўжо працоўная дынастыя: сын Мікалая Адольфавіча пасля завяршэння адукацыі вярнуўся ў родную гаспадарку аграномам.

МАЛАКО Ў КАРОВЫ НА ЯЗЫКУ

У дзень, калі мы прыехалі ў КСУП «Крынічная», тут узнагароджвалі найлепшых жывёлаводаў.

— У Мазырскім раёне штоквартальна падводзяцца вынікі спаборніцтва ў галіне жывёлагадоўлі, — тлумачыць **старшыня Мазырскага раённага камітэта прафсаюза работнікаў агрtoпрамысловага комплексу Аляксандр ШОБА.** — Спачатку вызначаюцца найлепшыя прадпрыемствы АПК, і ім уручаюцца пераходныя кубкі, потым найлепшыя жывёлаводы атрымліваюць граматы і грашовыя падарункі. Падобны падыход практыкуецца ў многіх рэгіёнах, але толькі ў нас на пастаяннай аснове, таму што дае выдатны вынік — становіцца стымулам да працы.

І справа нават не ў матэрыяльным заахвочванні, а ў тым, што намаганні кожнага канкрэтнага работніка заўважаныя і ацэненыя.

«Галіна Рыгораўна — самы сціплы наш працаўнік», — кажуць калегі аб **даярцы МТФ-600 «Гурыны» Галіне МАЛІЙ.** А кіраўніцтва гаспадаркі называе яе «эксклюзіўным прафесіяналам». Узнагарод за высокія вынікі працы за 20 гадоў у яе назапасілася нямала: напрыклад, нядаўна яна атрымала з рук кіраўніка раёна медаль «За ўдарную працу».

— Мне мая работа падабаецца. І вынік (дояць на МТФ «Гурыны» з адной каровы 50 літраў малака ў суткі), і аплата: я, напрыклад, зарабляю парадку 2 тысяч рублёў у месяц, — распавядае яна.

Работа даяркі нялёгкая: падымаецца прыходзіцца ў палову чацвёртай гадзіны раніцы, бо ў пяць — першая дойка. На 600 галоў дойнага статка — тры даяркі на змене. Усе працэсы на ферме аўтаматызаваныя, што і робіць магчымым такую колькасць даярак на дойны статак і такую якасць малака.

Узнагароджанне работнікаў МТФ-600 «Гурыны». Злева направа: жывёлавод Мікалай БЫХАН, ветурачы Уладзімір РАБЯНОК і Мікалай БАГДАНОВІЧ, старшыня Мазырскай раённай арганізацыі прафсаюза работнікаў АПК Аляксандр ШОБА, старшыня першічнай прафсаюзнай арганізацыі эксперыментальнай базы «Крынічная» Ілона ШЧАРБІНА, аператары машыннага даення Галіна МАЛІЙ, Надзея КРАСНІКАВА і Крысціна КАВАЛЕНКА.

Малако ў каровы на языку, тлумачыць Галіна Рыгораўна. Разумна складзены рацыён і добры догляд — высокія надоі.

— Здароўе жывёл цалкам залежыць ад кармлення, умоў утрымання і стаўлення да іх персаналу, — адзначае **ветурач-гінеколаг і тэхнік-асемянатар Мікалай БАГДАНОВІЧ.** — У рацыён жывёлы ў нас уваходзіць больш за 10 кампанентаў, сянаж трох відаў, канцэнтраты, камбікорм, жмыхі — усё гэта каштоўныя вітамінізаваныя кармы.

У малочнай вытворчасці асабліва важная пунктуальнасць, падкрэслівае ён: своечасова пакарміць і падаіць, у належны час выявіць хворую жывёлу і прызначыць лячэнне. Гэта і ёсць дабрабыт фермы — згуртаванасць усяго калектыву.

Мікалай Аляксандравіч — прадстаўнік маладога пакалення аграрыяў. Распавядае, што трапіў у «Крынічную» па размеркаванні, а пасля вырашыў застацца.

— Чаму моладзь з'язджае з вёскі?.. Напэўна, баіцца цяжкасцяў. Зарплаты, калі прадпрыемства паспяховае, цяпер у сельскай гаспадарцы нядрэнныя. Ды і ў аграгарадках ёсць усё для нармальнага жыцця. А што датычыцца цяжкасцяў... Калі чалавек знайшоў сябе ў сельскагаспадарчай прафесіі і яму на першым этапе дапамаглі і падтрымалі, як гэта было ў свой час са мной, ён будзе належна працаваць.

Суразмоўца лічыць, што з кіраўніком КСУП «Крынічная» пашанцавала, і гэта стала яшчэ адным важкім аргументам на карысць таго, каб застацца працаваць па месцы размеркавання:

— Мікалай Рыгоравіч Рубаха, наш кіраўнік, таксама любіць сваю працу, як і мы, і за гэта мы яму ўдзячныя. Ён добрасумленны і адказны чалавек, заўсёды прыслухоўваецца да меркаванняў калектыву і рэалізоўвае нашы прапановы. Новаўвядзенні па нарыхтоўцы кармоў і лячэнні жывёл, новыя тэхналогіі сельскай гаспадаркі — усё гэта складаецца і ў высокія вытворчыя паказчыкі, і ў высокія зарплаты.

Малако ацэньваецца па колькасці бялку і тлустасці, распавядае Мікалай Багдановіч.

— Бялку павінна быць не менш за 3 %, а ў нас стабільна 3,2 % і вышэй. Стандартная тлустасць малака — 3,6 %, а ў нас — 3,8—4 %. Здаецца, розніца невялікая, але па смаку гэта зусім іншае малако. І нашы пакупнікі гэта цэняць. Мы стараемся, каб наша малако было найлепшай якасці і каб малаказавод не меў да нас ніякіх прэтэнзій.

Пра **трактарыста-машыніста Уладзіміра ЛІПСКАГА** кажуць: гэта вельмі адказны працаўнік.

— Адказнасць — самая каштоўная якасць у працы аграрыяў, — падкрэслівае Аксана Грыб. — Напрыклад, у перыяд нарыхтоўкі кармоў важна не проста ўбраць травы або кукурузу, а зрабіць гэта ў патрэбны кароткі прамежак часу менавіта ў тым стане, які неабходны для выгадавання якаснага корму.

Родам Уладзімір з Ельска. Пераехаў, прадпрыемства выдзеліла жыллё. Жонка таксама працуе ў КСУП «Крынічная», у кукурузакалібровачным цэху. Сыны вучацца: старэйшы — у Мазыры, малодшы — у школе, у аграгарадку Крынічны.

— Адказнасць патрэбная ўсюды: на працоўным месцы і ў сям'і. І я сапраўды адказна стаўлюся да працы, — згаджаецца Уладзімір Рыгоравіч. — Так мяне выхавалі бацькі.

Кажуць, на вёсцы гарачая пара — лета, а зімой можна расслабіцца. Гэта так, але толькі не ў жывёлагадоўлі: каровы і цяляты патрабуюць догляду ў любую пару года, у выхадныя і ў святы.

— Расслабляцца няма калі, — усміхаецца суразмоўца. — Але мне гэта па душы. Тым больш калі кіраўніцтва заўважае намаганні. Гэта натхняе на працу.

Аператар машыннага даення Галіна МАЛІЙ.

Трактарыст-машыніст Уладзімір ЛІПСКІ.

Пакой прыёму ежы і душавая на ферме «Высокая» ў вёсцы Гурыны.

ЯК «РОБЯЦЬ» ЦЯЛЯТ

Уздоўж засеяных палёў едзем на МТФ «Высокая».

— Я трапіла сюды працаваць у 1987 годзе па размеркаванні пасля тэхнікума. Потым атрымала вышэйшую адукацыю, — распавядае **заатэхнік і тэхнік-асемянатар Марына БУКІШ.** — У 1990-я сярод кароў пачаўся лейкоз, значна ўпала колькасць статка. Я са старажылаў — мы змагаліся з лейкозам ад першага да апошняга дня. Паступова абнавілі статак.

Так што сённяшні дабрабыт гаспадаркі — шмат у чым асабістая заслуга найстарэйшых яго работнікаў.

— У нашай гаспадарцы — поўны цыкл гадавання жывёлы: ад маладняку да цялушкі ў малочны статак і да бычка на адкорм. А мая сфера адказнасці — якасныя, здаровыя цяляты. Я цялят «раблю», — усміхаецца субяседніца.

У гаспадарцы нараджаецца да 250 цялят у месяц, распавядае яна. На кожнай ферме ёсць прыплод, цялятнікі цалкам запоўненыя.

— Мы працуем з РСУП «Гомельдзяржплемпрадпрыемства», за нашай гаспадаркай замацаваны якасныя быкі-вытворцы. Але галоўнае для атрымання здаровага маладняку — узгодненая праца ўсяго калектыву. У сельскай гаспадарцы немагчыма быць прафесіянам толькі ў сваёй вузкай сферы, асобна ад усіх. Я не магу быць найлепшым асемянатарам, калі працую з хворай або галоднай жывёлай. Наўрад ці што атрымаецца, нават калі ў мяне залатыя рукі.

А нараджаюцца цяляты на ферме «Белая». Тут іх гадуюць да 20 дзён і потым перадаюць калегам з іншых ферм.

— Вось мае дзеткі! — **галоўны жывёлавод МТК-720 «Белая» Наталля ВОЙЦЕК** паказвае на шэрагі «хатак», у кожнай з якіх — нованароджанае цяля.

Наталля Леанідаўна кажа, што галоўны складнік поспеху — дакладнае прытрымліванне тэхналогіі.

— У першую гадзіну жыцця цяля павінна атрымаць якаснае малозіва з высокім утрыманнем імунаглабулінаў — іх узровень вызначаецца пры дапамозе каластометра. Выразна рэгламентуецца тэхналогіяй і колькасць малозіва — 10 % ад масы цела. Калі цяля важыць 30 кілаграмаў, у яго арганізм павінна паступіць тры літры малозіва, і не грамам менш. Працэдуру паўтараем праз 12 гадзін. А потым — яшчэ раз.

Двойчы выпойванне вырабляюцца дрэнчарам, гэта гарантуе, што ні кроплі каштоўнага прадукту малы не праль. Трэці раз цяляты п'юць малозіва ўжо з соскі. Тэмпература субстанцыі павінна складаць 39 градусаў — не 37 і не 41, тут важная дакладнасць, тлумачыць Наталля.

— У нас усё строга на хвілінах, грамах і градусах — дробязяў у такой працы не бывае.

Працуюць з дзясяткамі нованароджаных чатырохногіх «дзетак» усяго два спецыялісты, і, каб не «збівацца з ног», трэба быць педантам: максімальна дакладна выконваць адпрацаваную тэхналогію.

— Затое як прыемна, калі цяляты не хварэюць і дадаюць па кілаграме вагі ў суткі! — кажа яна.

Найлепшыя работнікі ТФ «Высокая». Злева направа: жывёлаводы Надзея МАШЧЫЦ, Валерый КУЛАЖЭНКА, Наталля ЯРАШ, Алена ХОМІЧ, брыгадзір таварнай фермы «Высокая» ў вёсцы Гурыны Марына ПАПОВА, жывёлаводы Марыя ЯВОРСКАЯ, Алена КРЫШКАВЕЦ, старшыня Мазырскай раённай арганізацыі прафсаюза работнікаў АПК Аляксандр ШОБА, жывёлавод Наталля ЗУБАРАВА, старшыня першічнай прафсаюзнай арганізацыі эксперыментальнай базы «Крынічная» Ілона ШЧАРБІНА.

Злева направа: ветфельчар Анастасія ПІВАВАРАВА і жывёлавод Наталля ВОЙЦЕК.

АБ ДЫСЦЫПЛІНЕ І ПРЫЗВАННІ

Аб працоўнай дысцыпліне як складніку поспеху гаворыць і **Вольга МЯСІШЧАВА**, якая стала па выніках конкурсу жывёлаводаў найлепшай загадчыцай малочнатаварнай фермы. Узначаліла ферму Вольга Уладзіміраўна ў 2018 годзе і прызнаецца, што спачатку ёй даводзілася зарабляць аўтарытэт у сваіх падначаленых.

— Якраз тады ў нас у гаспадарцы пачалася грандыёзная перабудова ў плане дысцыпліны. І мне таксама хацелася многае на ферме перабудаваць на свой лад. Хацелася, каб ферма стала ўзорнай. На шчасце, калектыў мяне падтрымаў — і сёння ў нас ёсць вынік.

Вольга лічыць, што галоўным прынцыпам кіраўніка любога калектыву павінна быць справядлівасць: як адпрацаваў — так і зарабіў.

КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» сабрала прафесіяналаў сельскай гаспадаркі з многіх рэгіёнаў. А вось **трактарыст-машыніст малочнатаварнага комплексу «Скрыгалаў» Аляксей КРЫШТАПЕНКА** «дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся» (як ён кажа пра сябе).

— У гаспадарку прыйшоў працаваць у 1975 годзе, і ўсё жыццё ў мяне — адзін запіс у працоўнай кнізе. Навошта кудысьці хадзіць, скакаць з месца на месца? Мне здаецца, кожны будзе шчаслівейшы, калі навучыцца шанаваць сваё.

Аляксей Міхайлавіч — надзвычай пазітыўны чалавек: часцей за іншыя словы ў размове ён прамаўляе слова «падабаецца».

— Мне падабалася раней працаваць на камбайне. Амаль 40 гадоў адпрацаваў і на сяўбе, і на ўборцы. Цяпер падабаецца працаваць на кормараздатчыку.

Тут патрэбны вопыт і асаблівы тэмперамент, тлумачыць ён. Вельмі карпатлівая праца. На яе здатныя самыя вопытныя і надзейныя.

Праца на кормараздатчыку — гэта 30 дзён у месяц 24 гадзіны ў суткі.

— З чатырох раніцы да дзевяці працую і да пяўдня адпачываю, потым праца да чатырох і з сямі да паловы дзясятай. За гады ў сельскай гаспадарцы ў мяне выпрацавалася звычка: 4 гадзіны на сон хапае. Калі на пенсію пайшоў, быццам бы з'явіўся час адаспацца. Дык не: устану ў палову чацвёртай, на вуліцу выйду, людзі на працу ідуць, а я ім зайздрошчу. Так што вырашыў: буду працаваць. Бо праца ў сельскай гаспадарцы — гэта і ёсць жыццё: чалавек у яе ўлюбеецца і ёю жыве.

Брыгадзір малочнатаварнага комплексу «Скрыгалаў» Вольга МЯСІШЧАВА.



Трактарыст-машыніст малочнатаварнага комплексу «Скрыгалаў» Аляксей КРЫШТАПЕНКА.

УНП 400064760

ДАМЫ З ПЕРСПЕКТЫВАЙ НА КАМФОРТ

Як Мазырскі домабудаўнічы камбінат фарміруе самую нізкую ў краіне цану квадратнага метра жылля?

Дом — не проста сцены, бетонныя перакрыцці, вокны і дзверы. Кожны напаўняе гэтае паняцце ўласным сэнсам, хоць у ім шмат агульнага для ўсіх. Але каб адчуць у поўнай меры радасць пабудовы свайго ўласнага ўтульнага свету на асобна ўзятай жыллоплошчы, павінны сысцісся вельмі многія акалічнасці. Каб сцены былі роўнымі і моцнымі, планіроўка — зручнай, прастора — дастатковай, а кошт — прымальным. Менавіта такое жыллё ўзводзяць будаўнікі Мазырскага домабудаўнічага камбіната. Да таго ж ім удаецца забяспечваць самы нізкі кошт квадратнага метра ў нашай краіне.

Генеральны дырэктар ААТ «Мазырскі домабудаўнічы камбінат» Аляксандр СОБАЛЕЎ.

Шматкватэрныя жылыя дамы ў мікрараёне нумар 4 г. Мазыра па бульвары Юнацтва.

Сёння Мазырскі ДБК займае лідзіруючыя пазіцыі ў сваім раёне па аб'ёмах жыллёвага будаўніцтва.

— Наша цана квадратнага метра жылля ў 2021 годзе не перавышала тысячы беларускіх рублёў за квадратны метр. Па ўводзімых аб'ектах на дадзены момант яна будзе знаходзіцца ў межах 1050-1120 рублёў за «квадрат», — канстатуе **генеральны дырэктар ААТ «Мазырскі домабудаўнічы камбінат» Аляксандр СОБАЛЕЎ.**

ПРАЦАВАЦЬ ПА-НОВАМУ

Пасляховым прадпрыемства было не заўсёды. Створаны Мазырскі домабудаўнічы камбінат на базе Мазырскага завода будіндустрыі. Расіяне спраектавалі для нас касетную ўстаноўку ў 1987-м. Сёлета будаўніцтву камбіната спаўняецца 35 гадоў. У яго гісторыі бывалі не толькі ўзлёты, але і цяжкія часы.

— Тады наша кіраўніцтва прыняло рашэнне правесці мадэрнізацыю. Прадпрыемства перафармаціравалася цалкам. Было закуплена сучаснае абсталяванне ад найлепшых сусветных вытворцаў. Прычым мадэрнізацыю камбінат правёў, не спыняючы работу. І з тых часоў прыступка за прыступкай прадпрыемства выбралася з крызісу і паднялося на свой цяперашні ўзровень, — распавядае **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце ААТ «Мазырскі домабудаўнічы камбінат» Вольга СОБАЛЕВА**.

— Мы мадэрнізаваліся першымі ў краіне сярод будаўнічых арганізацый, — успамінае **намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці Іван ЛЕБЕДЗЕЎ.**

Комплексная праграма мадэрнізацыі і тэхнічнага пераазнаўлення вытворчасці пачалася на ДБК у 2007 годзе і дала прадпрыемству магчымасць ісці ў нагу з часам. Дзякуючы ёй камбінату ўдалося паскорыць вытворчыя працэсы, палепшыць якасць выпускаемай прадукцыі, знізіць энерга- і працаёмкасць, сабекошт будаўніцтва і кошт квадратнага метра жылля, павялічыць заробную плату на вытворчасці.

Былі ўведзены ў эксплуатацыю дзве стэндавыя лініі па вырабе вонкавых сценавых панэляў і пліт перакрыцця італьянскай фірмы OLMET; у бетонамяшальным цэху праведзена замена чатырох бетонамяшалак на абсталяванне з аўтаматызаваннай падрыхтоўкай і падачай бетону і растворау; у арматурным цэху ўстаноўлена сучаснае аўтаматызаванае абсталяванне аўстрыйскай фірмы EVG па вырабе каркасаў і сетак. А ў фармовачным цэху ўведзена ў эксплуатацыю сістэма адраснай падачы бетону нямецкай фірмы Weckenmann. Адначасова з заменай абсталявання адбывалася асваенне выпуску новых відаў зборных жалезабетонных вырабаў — варыянт канструктыўнага рашэння з вонкавымі трохслойнымі энергаэфектыўнымі сценавымі панэлямі. Вынікам своечасовай маштабнай работы стала павелічэнне аб'ёмаў уводзімага жылля сучасных спажывецкіх якасцяў.

Мадэрнізацыя вытворчасці для ААТ «Мазырскі домабудаўнічы камбінат» — не разавая кампанія, а пастаянны працэс, які дазваляе ў выніку будаваць жыллё па даступнай для жыхароў краіны цане. Менавіта таму кошт квадратнага метра Мазырскага домабудаўнічага камбіната — адзін з самых прывабных у краіне, падкрэслівае Вольга Собалева.

Так, летась ДБК увёў новую касетную ўстаноўку для фарміравання ўнутраных панэляў дамоў.

— Мы правялі тэндар, які выйграла кампанія з Санкт-Пецярбурга. Расіяне спраектавалі для нас касетную ўстаноўку і ў лістападзе 2021 года ўвялі ў эксплуатацыю. Сёння гэта абсталяванне дапамагае нам выраблять унутраныя перагародкі, якія не патрабуюць выдаткаў на атынкоўку і выраўноўванне, — распавядае Іван Лебедзеў. — Сценавыя панэлі паступаюць на будоўлю ўжо ў поўнай заводскай гатоўнасці, гатовыя да канчатковага афармлення.

Традыцыйна будаўнічыя камбінаты знаходзяцца ў залежнасці ад вялікай колькасці пастаўшчыкоў. Мазырскі ДБК вырашыў адысці ад такой залежнасці — гэта спрашчае многія рабочыя моманты і, у рэшце рэшт, робіць больш танным жыллё для спажыўца.

ПРЫНЦЫПЫ РАЗУМНАЙ ЭКАНОМІІ

Прафесіяналы Мазырскага ДБК даюць людзям магчымасць набыць жыллё выдатнай якасці па адносна невысокай цане.

— Перш за ўсё, трымаць цану атрымліваецца за кошт уласнай вытворчасці і скарачэння нарматыўнага тэрміну будаўніцтва, — тлумачыць Вольга Віктараўна.

Пры гэтым скарачэнне тэрмінаў не ўплывае на якасць будаўніцтва, паколькі камбінат працуе кругласутачна. Сучасныя панэльныя дамы па цеплаправоднасці не саступаюць цагляным, а будуюцца значна хутчэй — значыць, і каштуюць танней, падкрэслівае яна.

— Мы пастаянна працуем над зніжэннем выдаткаў, — адзначае Іван Іванавіч. — У нас практычна нулявая вытворчасць: мы закупляем матэрыялы і выпускаем гатовы прадукт.

На камбінаце вырабляецца практычна ўся прадукцыя, неабходная для будаўніцтва жылога дома: жалезабетонныя перагародкі, пліты перакрыцця, сценкі лоджый, вентблокаў, шахты ліфтаў, элементы лесвіц і ўваходаў, плиты і агароджы лоджый, пенапласт і пластыкавыя вокны. Такім чынам, сёння прадпрыемства здольнае з уласнай прадукцыі пабудаваць жылы дом пад ключ. Тэхналагічны працэс наладжаны так, што ўсе вырабы і жалезабетонныя канструкцыі амаль цалкам рыхтуюцца ў заводскіх умовах.

— Мы закупляем практычна толькі пяўняя камплектуюшія (дзверы, сантэхнічнае і электрычнае абсталяванне), — падкрэслівае суразмоўнік.

Намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Вольга СОБАЛЕВА.

Эканомія вады і газу пры вытворчасці таксама зніжае сабекошт выпускаемай прадукцыі, адзначае ён. Выпуск пенапласту, работа з рэцэптурамі цэментаў, уключэнне ў іх сучасных дабавак — усё гэта дазваляе зрабіць «квадрат» яшчэ таннейшым для канчатковага спажыўца.

— Ёсць у нас і свае «аддзелачнікі», калі па праекце мяркуюцца кватэры з адстройваннем. Цяпер будуем у Мінску вялікі дом — 20 000 квадратных метраў, 6 пад'ездаў, 11 паверхаў, там шмат кватэр з адстройваннем: вокнамі, дзвярыма, шпалерамі, ламінатам і плиткай. У Гомелі пабудавалі 20 кватэр з адстройваннем. У нас свая служба сантэхнікаў, электрыкаў. Гэта значыць, мы бяром участак і аддаём людзям гатовы прадукт: дамы, прыдатныя да пражывання.

Але ці не адбіваецца эканомія на якасці кватэр?

— Мы эканомім з розумам, ускараняючы новыя сучасныя матэрыялы і тэхналогіі. Маем зносіны з усімі прадпрыемствамі ў краіне, дзелімся ўласнымі напрацоўкамі, і ў іх таксама часам чэрпаем новыя ідэі і ўкараняем у сваю вытворчасць. Нядаўна правялі выпрабаванні на цеплатэхніку вонкавай сцяны і атрымалі выдатны каэфіцыент па супраціўленні цеплапередачы — 4,23 пры нарматыве 3,2 м²•°С/Вт, — адзначае Іван Лебедзеў.

На прадпрыемстве функцыянуе сістэма менеджменту якасці ISO 9001, пацвержаная сертыфікатам адпаведнасці.

— Мы не зацікаўленыя здаваць у эксплуатацыю някаснае жыллё, — кажа намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце. — Сёння, згодна з законам, дом, пабудаваны намі, пяць гадоў знаходзіцца ў нас на гарантыі. Мы цалкам забяспечваем ліквідацыю ўсіх дэфектаў, якія ўзнікаюць за гэты перыяд пры эксплуатацыі дома. І чым горш выкананы работы, тым больш забудоўшчык марнуе на ліквідацыю непаладак. Плюс скаргі ад людзей, негатыў, а мы хочам, каб наша жыллё прыносіла радасць. Каб яно каштавала танней, каб у ім было прыемна жыць. Гэта наш прэстыж, наш аўтарытэт у пакупніка.

ДАВЕР СПАЖЫЎЦА

Прапанова ад Мазырскага ДБК знаходзіць попыт у многіх гарадах Беларусі і ў Расійскай Федэрацыі. На тэрыторыі Мазырскага раёна домабудаўнічы камбінат — адзін з асноўных экспарцёраў будаўнічых паслуг.

— З 2012 года Мазырскім домабудаўнічым камбінатам сумесна з інвестыцыйна-будаўнічай кампаніяй «Інжынер» выканана забудова жылога комплексу з дзесяціпавярховых панэльных дамоў у «Беларускім квартале» на Майскім бульвары горада Курска, — распавядае намеснік дырэктара па вытворчасці. — У Курчатаве, горадзе атамшчыкаў, увялі ў эксплуатацыю два стокватэрныя жылыя дамы. З 2012 да 2020 года ўвялі ў эксплуатацыю 100 тыс. кв. м жылля.

Як зарабляецца давер спажыўца?

— Вядома, вельмі важныя цана квадратнага метра і якасць жылля, якое ўзводзіцца, — адзначае Вольга Собалева.

Сфера адказнасці Мазырскага ДБК — у асноўным сацыяльнае жыллё. Шмат уводзяць мазырскія будаўнікі арэнднага жылля, будуюць кватэры і таўнхаўсы для шматдзетных сем'яў.

Захоўваючы нязменна высокую якасць, гібка рэагуюць на патрабаванні рынку.

— Мы лёгка перабудоўваемся тэхналагічна пад любую серыю, любы дом. Можам пабудаваць і 19-павярховую «высотку», і таўнхаус, і аднапакаёвыя, і шасціпакаёвыя кватэры.

Праектаванне новых дамоў для Мазырскага ДБК вядзецца інстытутамі «Палессепраект» і «Белдзяржпраект» (з імі прадпрыемства супрацоўнічае на працягу 30 гадоў).

— Мы імкнёмся ўлічыць усе пажаданні і заўвагі, — адзначае Іван Лебедзеў. — Цяпер модная тэндэнцыя ў жыллёвай архітэктуры звязана са студыямі: людзі хочуць мець сумешчаную кухню-сталовую, а таксама гардэробную, кладоўку і г. д. У прыярытэце французскія вокны, лоджыі са шкленнем да падлогі. Мы ідзём насустрач пажаданням: нам таксама цікава шукаць нестандартныя рашэнні.

Немалаважным аспектам сучаснага жылля калектыў Мазырскага ДБК лічыць і эстэтычны. Многія ўзведзеныя прадпрыемствам дамы можна назваць творамі мастацтва. Напрыклад, два нядаўна пабудаваныя дамы на беразе Прыпяці. За кошт бліжэйшай вады і пясчанага пляжа пад вокнамі ствараецца ўражанне, што жывеш на марскім курорце. Або цэлы раён стыльных таўнхаўсаў для шматдзетных сем'яў — з гаражом і тэрасай. Квадратны метр у іх абышоўся ўладальнікам не больш за 1000 BYN.

Сёння домабудаўнічы камбінат падыходзіць да рэалізацыі нового праекта — дома з убудаванымі офіснымі і гандлёвымі памяшканнямі на першым паверсе.

— Там мы ўжываем новыя планіровачныя і тэхнічныя рашэнні. У прыватнасці, вынасныя кансолі на балконах і лоджыях — мы падгледзелі іх у Еўропе.

Хто правільна думае, той правільна працуе і рухаецца ў правільным кірунку, кажа намеснік дырэктара па вытворчасці. Гэты прынцып дазваляе мазырскім будаўнікам ажыццяўляць для тысяч людзей мару аб уласным утульным доме.

УНП 400083890.

Толькі факты

• Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2016 года № 225 «Аб занясенні на рэспубліканскую Дошку гонару пераможцаў спаборніцтваў за 2011—2015 гады і 2015 года» ААТ «Мазырскі домабудаўнічы камбінат» прызнана пераможцам спаборніцтва і занесена на рэспубліканскую Дошку гонару за дасягненне ў 2015 годзе найлепшых паказчыкаў сярод арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у будаўніцтве.

• У актыве прадпрыемства — пасведчанне аб занясенні на Дошку гонару Гомельскай вобласці па выніках работы за 2009, 2011, 2014, 2016, 2019, 2021 гады. ААТ «Мазырскі ДБК» — пераможца ў намінацыі «Найлепшая арганізацыя, якая ажыццяўляе дзейнасць у сферы будаўніцтва».

• Дыплом I ступені ў спаборніцтве па сацыяльна-эканамічным развіцці Мазырскага раёна за 2010, 2013, 2014, 2015, 2018, 2019, 2021 гады сярод будаўнічых арганізацый.

• Дыплом пераможцы «Найлепшая арганізацыя па ахове працы» ў 2015, 2018, 2020, 2021 гадах сярод будаўнічых арганізацый раёна.

• Дыплом пераможцы агляду-конкурсу на найлепшую арганізацыю работы па ахове працы на тэрыторыі Гомельскай вобласці за 2018, 2020, 2021 гады сярод будаўнічых арганізацый.

• Дыплом лаўрэата конкурсу на найлепшае дасягненне будаўнічай галіны Рэспублікі Беларусь за 2009—2020 гады.

• Дыплом пераможцы конкурсу ў намінацыі «Найлепшы будаўнічы прадукт, 2015—2020 гады».

Намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці Іван ЛЕБЕДЗЕЎ аглядае новыя таўнхаусы.

Слесар-зборшчык будаўнічых канструкцый Дзмітрый СІНГАЕЎСКІ збірае каробкі аконнага блока.

Будаўніцтва дамоў па вул. Рыжкова г. Мазыра.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

• Аб'ём падрадных работ, выкананых ААТ «Мазырскі ДБК» уласнымі сіламі ў дзеючых цэнах, — 63 107 тыс. руб., тэмп росту склаў 106,3 % да ўзроўню мінулага года;

• сярэднямесячная заработная плата ў цэлым па прадпрыемстве —1565 рублёў, тэмп росту да ўзроўню мінулага года склаў 108,4 %;

• паказчык па энергазберажэнні — мінус 4,5 % пры заданні мінус 3,9 %.

• Згодна з праграмай будаўніцтва жылых дамоў на 2022—2023 гг., за плануемы аб'ём уводу аб'ектаў за кошт усіх крыніц фінансавання — 103 610 м². У тым ліку ў Гомельскай вобласці — 68 607 м², або 66,2 % ад агульнага планаванага аб'ёму, у Мінскай вобласці — 20 130,00 м² (19,4 %), у Магілёўскай вобласці — 5 829 м² (5,6 %), у Расійскай Федэрацыі — 9 044 м² (7,7 %).

Мовай лічбаў

• Аб'ём падрадных работ, выкананых ААТ «Мазырскі ДБК» уласнымі сіламі ў дзеючых цэнах, — 63 107 тыс. руб., тэмп росту склаў 106,3 % да ўзроўню мінулага года;

• сярэднямесячная заработная плата ў цэлым па прадпрыемстве — 1565 рублёў, тэмп росту да ўзроўню мінулага года склаў 108,4 %;

• паказчык па энергазберажэнні — мінус 4,5 % пры заданні мінус 3,9 %.

Начальнік фармовачнага цэха Яўген БАГДАНОВІЧ разам з майстрам Святланай ШАФАРЭНКАЙ праяўляюць тэхналагічную лінію на адпаведнасць канструкцыі.

Зварышыца арматурных сетак і каркасаў Алена РАЎЧАНКА за работай.

Аператар сетказварачнай машыны Мікалай АБІБОК злучае арматурныя сеткі.

Начальнік арматурнага цэха Анатоль БАГДАНІК.



Аператар Сяргей ДАНІЛЕНКА выраблене дэталі на клямарным аўтамаце.

• За 2021 здадзена ў эксплуатацыю за кошт усіх крыніц фінансавання 84135 м² жылля. У тым ліку ў Рэспубліцы Беларусь — 75 091 м² і 9 044 м² на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

• З агульнага аб'ёму пабудаваных аб'ектаў 72,6 % — у Гомельскай вобласці, 16,6 % — у Мінскай вобласці, 10,7 % — у Расійскай Федэрацыі.

МОЗЫРЬСОЛЬ
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

СОЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

«Мазырсоль» працуе з поўнай загрузкай: СОЛІ ХОПІЦЬ УСІМ!

Аператар Дзяніс НОВІКАЎ за пультам кіравання фасовачнай лініі.

Начальнік змены Сяргей ХАРОШКА і аператар Леанід РУБЛЁЎСКІ: «Магутнасць фасовачнай расійска-нямецкай лініі – 140 тон на суткі».

Намеснік генеральнага дырэктара па ідэалогіі і сацыяльным развіцці Таццяна ВІТКОЎСКАЯ дэманструе тэхналагічны трубапровад, па якім канцэнтраваны расол для вырабу солі дастаўляецца на прадпрыемства.

ААТ «Мазырсоль» чытачам прадстаўляць не трэба. Гэта адзін з самых вядомых беларускіх брэндаў. Больш за тое, гэты прамысловы гігант уваходзіць у лік прадпрыемстваў, якія можна назваць візітнай карткай краіны. «Сёння на «Мазырсолі» цалкам загружаныя вытворчыя магутнасці і практычна пустыя склады: прадпрыемства працуе на ўнутраны рынак і працягвае пастаўляць сваю прадукцыю на экспарт», — адзначае генеральны дырэктар Уладзімір ДВОРНІК.

Соль — жыццёва неабходны кампанент у харчаванні чалавека. Хларыд натрыю ўдзельнічае ў рэгуляванні водна-салявога балансу ў арганізме, падтрымлівае тонкія біялагічныя механізмы натрый-каліевага абмену. Іоны натрыю і хлору адыгрываюць ключавую ролю ў такіх працэсах як правядзенне нервовых імпульсаў, выпрацоўка салянай кіслаты ў страўніку, рэгуляцыя артэрыяльнага ціску і нармалізацыя росту мышачнай і касцявой тканак. Акрамя таго, NaCl — незаменны «ўдзельнік» многіх сучасных вытворчасцяў. Перш за ўсё, вядома, харчовых — гэта адзін з самых універсальных узмацняльнікаў смаку для большасці страў. Але таксама соль неабходная ва ўсіх тэхналагічных працэсах, дзе патрабуецца змякчэнне вады. Соль ужываюць у сельскай гаспадарцы, медыцыне, хімічнай прамысловасці. Але як для здароўя чалавека, так і для захавання тэхналагічных працэсаў важна, каб кухонная соль не ўтрымлівала нічога, акрамя солі. 40 % хлору і 60 % натрыю, без старонніх прымешак настолькі, наколькі гэта наогул магчыма. Ну а смак у якаснай солі павінен быць просты салёны, без горкачы ці кіслінкі. Менавіта такую прадукцыю выпускае прамысловы гігант ААТ «Мазырсоль».

ЭТАЛОН ЧЫСЦІНІ

Буйным заводам па вытворчасці солі важна мець сваю надзейную сыравінную базу. У «Мазырсолі» прыроднае радовішча знаходзіцца за тры кіламетры ад асноўнай вытворчасці. Сёння ў прадпрыемства 10 дзеючых свідравін, адкуль здабываецца саляны расол.

Галоўны тэхнолог Пётр ГАПІЕНКА: «Чысціня нашай солі – 99,7%».

І тут, мабыць, варта звярнуцца да гісторыі знакамітага брэнда. Калі ў 1982 годзе ў Мазыры пачаў працаваць новы завод па вытворчасці вакуум-выварной солі, і тэхналагі, і спажыўцы адзначылі чысціню крышталя, які вырабляўся тут (а гэта і бездакорна салёны смак, і эканамічны расход). За мазырскую соль пакупнікі тады «галасавалі рублём» па ўсім СССР. А дзякуючы сучасным тэхналагічным рашэнням першапачаткова высокая якасць мазырскай прадукцыі ўзрасла, прадпрыемства асвоіла новыя магутнасці і новыя віды прадукцыі.

— Сучасная вытворчасць солі — гэта замкнёны цыкл: па сутнасці, мы бачым толькі канчатковы прадукт, усе тэхналагічныя працэсы праходзяць у закрытых аб'ёмах і рэгулююцца дакладнымі прыборамі, — тлумачыць **галоўны тэхнолаг ААТ «Мазырсоль» Пётр ГАПІЕНКА.** — Соль з прыроднага пласта падымаецца на паверхню ў выглядзе насычанага воднага раствору. Для гэтага ў свідравіну запампоўваецца вада пітной якасці. Яна насычаецца соллю і пад ціскам падымаецца наверх. З пляцоўкі расолапрамысла па трубах расол паступае на завод, дзе пазбаўляецца непатрэбных прымешак — солей кальцыю і магнію (якія, напрыклад, можна ўбачыць у чайніках у выглядзе накіпу). І ўсё гэта, паўтаруся, адбываецца ў закрытым цыкле — у трубаправодах, рэзервуарным парку, адстойніках. Ачышчаны расол паступае ў выпарныя сістэмы, частка з якіх працуе пад ціскам, а частка — у рэжыме вакууму. Там мы атрымліваем згушчаную суспензію. Суспензія трапляе ў цэнтрыфугу, дзе за кошт цэнтрабежнай сілы стрчвае непатрэбную ваду.

На выхадзе з цэнтрыфугі, распавядае спецыяліст, вільготнасць прадукту складае 2-3 %. Далей амаль гатовая соль паступае ў «печы» — сушыльныя ўстаноўкі, дзе яе сушаць гарачым паветрам пад вялікім ціскам. Прайшоўшы ўсе этапы, ужо цалкам гатовая чыстая, экалагічная, якасная соль паступае ў фасовачны цэх.

— Прадукцыя ААТ «Мазырсоль» належыць да класа «экстра», то-бок яна максімальна чыстая і адпавядае еўрапейскім стандартам якасці. Паводле дакументаў, чысціня нашай солі складае 99,7 %, але на практыцы мы трымаем узровень чысціні прадукту 99,8-99,9 %.

Дададзім, што менавіта смак солі «экстра», звыклай для сучаснага чалавека кухоннай солі, у поварачы лічыцца эталонам — ён чысты і салёны. Перасаліць стравы такой соллю больш складана, чым любой іншай.

У САЛЬНІЦЫ, ГРАНУЛАХ, ТАБЛЕТКАХ...

Сёння з цэхаў ААТ «Мазырсоль» выходзіць больш за 100 найменняў прадукцыі. Гэта і знаёмая кожнаму айчыннаму спажыўцу кухонная соль «Экстра», і соль ёдаваная, і «Беларуская» — вываранная соль з дадаваннем каменнай.

Намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях Грыгорый КАДОЛ: «80 % аб'ёму прадукцыі ААТ «Мазырсоль» ідзе на экспарт у больш чым 15 краін блізкага і далёкага замежжа».

Прадпрыемства працуе на ўнутраны рынак і пастаўляе прадукцыю на экспарт.

— У папулярнасці гэтага прадукту адыграла ролю звычка нашых пакупнікоў, якая склалася на працягу дзесяцігоддзяў, — тлумачыць **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалогіі і сацыяльным развіцці Таццяна ВІТКОЎСКАЯ.** — Памятаеце, калісьці нашы мамы і бабулі куплялі каменную соль у папяровых пакетах — іншай проста не было ў продажы? З тых часоў у старэйшага пакалення існуе думка, што каменная соль больш падыходзіць для засолкі і кансервавання. Хоць на самай справе яна адрозніваецца, па сутнасці, толькі больш буйным памолам, а таксама меншай ступенню ачысткі ад прымешак. Ідучы насустрач пажаданням пакупніка, мы распрацавалі адзін з самых папулярных нашых прадуктаў — соль «Беларускую», сумесь «экстры» і каменнай солі.

Таксама ў партфелі прадпрыемства — соль грануляваная для пасудамыечных машын (засцерагае награвальныя элементы ад утварэння вапнавых адкладаў, тым самым падаўжаючы тэрмін службы бытавой тэхнікі), соль таблетіраваная і соль грануляваная для водападрыхтоўкі ў прамысловых і бытавых сістэмах ачысткі, пасолачна-нітрытная сумесь для патрэб мясаперапрацоўчай прамысловасці, марская соль. Соль розных відаў выпускаецца ў рознай фасоўцы — ад звыклых поліэтыленавых упаковак да вытанчаных сальнічак, ад 250 г для ўжывання на кухні да тоны для прамысловага выкарыстання.

— У апошні час у нас змянілася канцэпцыя ўпакоўкі, — адзначае суразмоўніца. — Мы паступова сыходзім ад звычайнай поліэтыленавай фасоўкі: яе нязручна выкарыстоўваць, соль гаспадыням даводзіцца кудысьці перасыпаць. Новую поліэтылен-прапіленавую ўпакоўку дастаткова проста адкрыць, і яна будзе прыгожа стаяць у вас на кухні. Перасыпаць з яе соль у сальнічку не трэба, яе зручна выкарыстоўваць, і ў інтэр'ер кухні яна цалкам упісваецца.

Сучасная ўпакоўка, як і найвышэйшая ступень ачысткі мазырскай солі, сталі магчымыя дзякуючы маштабнаму тэхнічнаму пераснашчэнню прадпрыемства (яно распачалося ў 2014 годзе). Шэсць гадоў таму ў яго цэхах завяршылася мадэрнізацыя шэрагу ключавых участкаў, былі ўстаноўлены новыя лініі. А нядаўні, самы апошні набыток завода — фасовачныя лініі ў цэху фасоўкі і затарвання (цэх № 3), вынік супрацоўніцтва расійскай і нямецкай кампаній.

— Мы прынялі гэтую лінію ў эксплуатацыю ў лістападзе мінулага года, — расказвае Пётр Гапіенка.

Тут праводзіцца фасоўка і ўпакоўка, пачынаючы ад пакета і заканчваючы поўнай палетай, якая адразу можа паступаць у гандлёвую залу крамы. Пры гэтым абслугоўваннем тэхналагічных ліній займаюцца спецыялісты прадпрыемства — узровень прафесіяналізму супрацоўнікаў завода-гіганта дазваляе.

— У цэх нумар тры соль паступае ў выглядзе сыпкага прадукту, — працягвае галоўны тэхнолаг. — Любыя пераўтварэнні, якія з ёй адбываюцца, маюць месца толькі ў гэтым цэху. Уяўленне дабаўкі ёду, атрымання салільна-нітрытнай сумесі (яна выкарыстоўваецца толькі для вытворчых патрэб мясной прамысловасці, у рознічным гандлі яе няма) і гатак далей.

Дарэчы, у хуткім часе прадпрыемства адновіць вытворчасць і лінейкі ўласных прыпрай.

— У нашых найбліжэйшых планах — шырокі асартымент прыпраў: універсальных, для сала, для спагеці і бульбы, для розных відаў мяса. Нашы прыправы — цалкам натуральныя: толькі соль, рэзкія травы, спецыі. Ніякіх араматызатараў, фарбавальнікаў, кансервантаў, — падкрэслівае Таццяна Віткоўская.

ПЫТАННІ ГЕАГРАФІІ

Чаму пры такім складаным тэхналагічным працэсе соль каштуе для спажыўца капейкі? Уся справа ў масавасці прадукту, у велізарных аб'ёмах. «Мазырсоль» працуе ў кругласутачным рэжыме. Магутнасць толькі фасовачнай расійска-нямецкай лініі — 140 тон на суткі. А ў цэлым на суткі заход выпускае 2400 тон солі (100 тон у гадзіну). Яго вытворчыя магутнасці — 480 000 тон солі за год. І нават у цяперашніх няпростых эканамічных умовах прадпрыемства працуе з поўнай загрузкай, і пры гэтым яго склады практычна пустыя — усё сыходзіць літаральна «з калёс».

Трэба сказаць, што ААТ «Мазырсоль» сумесна з іншым «салявым гігантам» — ТАА «Беларуськалій» — закрывае больш за 99 % унутранага спажывання солі ў нашай краіне. Пры гэтым на ўнутраны рынак накіроўваецца ўсяго 20 % аб'ёмаў выпускаемай у Мазыры солі. 80 % — гэта экспарт у больш чым 15 краін блізкага і далёкага замежжа.

Гібкая палітыка прадпрыемства дазваляе задавальняць попыт і хутка перафарміраваць рынкі, распавялі на ААТ «Мазырсоль».

— Соль, якая выпускаецца нашым прадпрыемствам, цалкам канкурэнтаздольная, — гэта ўзровень чысціні нямецкай солі. А суадносіны цаны і якасці ў нас нават вышэйшыя, чым у Еўропе, — падкрэслівае **намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Мазырсоль» па камерцыйных пытаннях Грыгорый КАДОЛ.**

Што датычыцца рынкаў збыту, то геаграфія паставак не запатрабавала кардынальнага перагляду, адзначаюць на ААТ «Мазырсоль». Заслужаная за доўгія гады рэпутацыя сёння спрацоўвае на прадпрыемства, і розныя кампаніі па-ранейшаму выбіраюць «Мазырсоль» у якасці пастаўшчыка. Чысціні мазырскай солі даверяюць лідары харчовай вытворчасці і прамысловасці па ўсім свеце. Пастаянна развіваючыся, кампанія пралануе рынку сучасныя, запатрабаваныя прадукты. Так, таблеціраваная соль або салільна-нітрытная сумесь маюць значны экспартны патэнцыял.

— Асноўным рынкам збыту ў нас была і застаецца Расійская Федэрацыя, дзе мы апошнім часам нарошчваем сваю прысутнасць, — распавядае Грыгорый Кадол. — Пэўны рост ёсць на традыцыйных для нас рынках Казахстана і Кыргызстана, іншых краін СНД. Сёння стратэгія нашага прадпрыемства — выхад на новыя рынкі, у першую чаргу Паўднёва-Усходняй Азіі і Кітая.

Шмат у чым давер айчынных і замежных партнёраў да мазырскай прадукцыі звязаны з тым, што бяспечнасць для здароўя спажыўца — тая якасць, якую ААТ «Мазырсоль» лічыць асноватворнай.

— Высокія спажывецкія характарыстыкі нашай прадукцыі забяспечваюцца інтэграванай ва ўсе вытворчыя працэсы сістэмай кіравання якасцю, атэставанай стандартам ISO 9001, — падкрэслівае намеснік дырэктара па ідэалогіі. — Кантроль за якасцю прадукцыі ажыццяўляецца акрэдытаванай лабараторыяй прадпрыемства на кожным этапе ве вытворчасці.

ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР

Сучасныя вытворчыя памяшканні, бяспечныя ўмовы працы, дастойная заработная плата і выдатны сацыяльны пакет — усё гэта робіць працоўную дзейнасць на ААТ «Мазырсоль» прывабнай і дапамагае падтрымліваць высокі ўзровень прафесіяналізму і згуртаванасці калектыву.

Сёння на прадпрыемстве працуе 961 супрацоўнік (больш чым на 60 % калектыў мужчынскі), і кіраўніцтва кампаніі з задавальненнем кажа аб найвышэйшым узроўні прафесіяналізму сваіх работнікаў.

— Завод падтрымлівае маладых спецыялістаў, дае магчымасць развівацца і шанц паказаць сябе, — распавядае **аператар цэха № 3 Дзяніс НОВІКАЎ.** — Працую тут ужо 10 гадоў. Прыйшоў вучнем з другім разрадам, на працягу года атрымаў трэці, яшчэ праз два гады — чацвёрты, і ўжо сем гадоў маю пяты разрад.

Дзяніс кажа, што адчувае гонар за сваё прадпрыемства.

— Для свайі сям'і заўсёды купляю толькі мазырскую соль, — адзначае ён. — Таму што ўпэўнены ў яе якасці. У плане якасці і бяспекі ў нашай прадукцыі ўсё ў парадку.

Нягледзячы на кругласутачны рэжым работы завода — 24 гадзіны ў суткі, 7 дзён на тыдзень — уладкавацца на прадпрыемства няпроста: адтоку кадраў няма, як і недахопу жадаючых працаваць у яго цэхах. І нядзіўна: сярэдняя зарплата на «Мазырсолі» — 2,3 тыс. беларускіх рублёў.

— У нас вялікая канкурэнцыя на адно рабочае месца — у штат трапіць складана, — падкрэслівае суразмоўнік.

Не раз калектыў ААТ «Мазырсоль» станавіўся лаўрэатам прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці, а яго прадукцыя па праве перамагала ў конкурсе «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь». Брэнд «Мазырсоль» неаднойчы заваёўваў ганаровае званне «Брэнд года», мазырская соль паднімалася на п'едэстал гонару конкурсаў «Народная марка Беларусі» і «Прадукт года». Па выніках работы за 2021 год, ААТ «Мазырсоль» атрымала першынство ў намінацыі «Найлепшая прамысловая арганізацыя» Мазырскага раёна і занесена на Дошку гонару Гомельскай вобласці. І гэта — вынік не толькі сучасных тэхналагічных рашэнняў, але і плён чалавечага капіталу прадпрыемства: прафесіяналізму супрацоўнікаў на ўсіх узроўнях і вытворчых участках. Менавіта дзякуючы суладнай рабоце калектыву заводу ўдаецца не проста ўтрымліваць свае пазіцыі, але і ўпэўнена рухацца наперад.

Аператар лініі харчовай прадукцыі Дзяніс ГНЯДЗЬКО кантралюе якасць фасоўкі солі.

УНП 400087365

Матэрыялы падрыхтавалі Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.

ЛАНДШАФТ ПАМЯЦІ: ТЭМА ГЕНАЦЫДУ Ў БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦТВЕ

УСПАМІНАЦЬ ЦЯЖКА, ЗАБЫЦЬ НЕМАГЧЫМА

Л. Рублеўская: Думаю, няма сям'і на Беларусі, якая не мае сваіх трагічных гісторый пра перажытае ў час нямецкай акупацыі... Пераглядаю відэа, дзе мая мама, яшчэ жывая, распавядае выхаванцам дзіцячага дома, якія да яе прыйшлі на 9 Мая, пра вайну. Як карнікі падзялілі жыхароў вёскі Люці — жанчын, мужчын і дзяцей асобна... Кагосьці, як маю бабулю, выбралі, каб адправіць у канцлагер. Мая мама падбегла да свайго дзядулі Максіма, немец яе адштурхнуў... Дзядуля заступіўся, а карнік узяў аўтамат і як дасць дзеду па спіне... Дзядулю Максіма Часлаўскага, які дапамагаў партызанам, спалілі ў той адрыне... Шэсць чалавек з нашай сям'і там згарэла. Так, шмат хто мог распавесці падобныя гісторыі. Але ці адразу яны перайшлі ў паўнавартасныя мастацкія творы?

Г. Левіна: Так, для майго бацькі яго манументальныя праекты на тэму вайны былі заснаваныя на яго асабістых перажываннях. Калі казаць пра беларускае мастацтва, многія з мастакоў, скульптараў, хто перажыў вайну, хто ваяваў, па-свойму, вельмі па-рознаму, выказвалі свае ўспаміны. Бацька змог свае веды аб трагедыі Беларусі вывесці нават за межы Беларусі.

Н. Усава: Я, напрыклад, ведаю мастакоў, якія не любілі ўспамінаць вайну. І цяпер часта людзі гавораць, што іх бацька, дзед не любілі ўспамінаць пра вайну. Вельмі цяжка. І многія мастакі стараліся сысці ад гэтай тэмы, таму што гэта абуджала вельмі балючыя ўспаміны. Але сысці ад гэтага было немагчыма. Напрыклад, Міхаіл Чэпік, франтавік, якога з-за кантузіі пераклі працаваць санітарам, дзе ён наглядзеўся ўсякага, сыходзіў ад баталістыкі, крывавых сцэн у партрэты ветэранаў, выявы помнікаў... А вайну не выяўляў, ці рабіў тое сімвалічна. А на другім канцы — Міхаіл Савіцкі з яго цыклам «Лічбы на сэрцы», які адкрыта выяўляў смерць, пакуты, ахвяр, так натуралістычна, што некаторыя людзі страчаюць прытомнасць на яго выставах, настолькі гэта эмацыянальна ўздзейнічае.

Л. Р.: Я памятаю, як гучалі меркаванні: навошта так проста лінейна, натуралістычна — трупы, катаванні...

Н. У.: Два такія полюсы... А паміж імі вельмі шмат карцін на ваенную тэму. Найчасцей раскрывалася тэма партызанская, што натуральна для Беларусі, краіны-партызанкі... А вось выяўленне пакуты людзей — гэтая тэма не надта шырока віталася да з'яўлення кнігі Алеся Адамовіча, Уладзіміра Калесніка і Янкі Брыля «Я з вогненнай вёскі». У асноўным ваеннае мастацтва было трыумфальным.

Г. Л.: У выяўленчым мастацтве, магчыма, гэта і так, але раскасаць пра пакуты можна не толькі ў паказе фактаў пакутў. У комплексе «Хатынь» пакута паказаная не літаральна.

Н. У.: Так, там няма выявы чалавека, ахопленага полымем...

Г. Л.: Хоць можна было пайсці гэтым шляхам. Але тут увесь прынцып творчасці Леаніда Левіна — прачытанне вайны на ўзроўні эмпатыі, спачування, суперажывання. Бацька разбураў стэрэатыпы.

Л. Р.: Мы эсцы нядаўна, дарэчы, былі ў Красным Беразе, дзе знаходзіцца мемарыял памяці дзецям-ахвярам Вялікай Айчыннай вайны, спраектаваны Леанідам Левіным на месцы дзіцячага донарскага канцлагера. Ездзілі ўсёй сям'ёй... Мемарыял уразіў тым, наколькі ён светлы... Дзіцячыя малюнкі, белы колер стылізаваных пустых партаў, шмат паветра, працятага сонцам... Якраз быў сонечны дзень. Побач — яблыневы сад... Уражальны кантраст, калі ведаеш, што намсамрэч тут адбывалася: у маленькіх вязняў выкачвалі кроў для нямецкіх параненых. Там трэба пабываць... Убачыць цацкі, якія прыносяць і кладуць да ног бронзавай дзяўчынкі... Зразумела і зусім маленькім, і дарослым.

Г. Л.: Карціны вайны, якія мой бацька запомніў са свайго дзяцінства, пакінулі яму вельмі шмат розных пачуццяў... Менавіта розных. Не толькі страшных. І ўспамін пра смак кавуна на дзень нараджэння, які мама яму дала. І ўспамін, як хавалі маму, калі жылі бежанцамі ў Кіргізіі. У бацькі былі вельмі абвостраныя адчуванні гэтай тэмы. Ён не мог, скажам, паставіць акну скульптуру дзяўчынкі, пра якую вы згадалі... Ён быў рэжысёрам праспекту, што распавядае пра вайну. Дарэчы, з'яўленне мемарыяла

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)

Хатыні спарадзіля ўсплёск з'яўлення іншых твораў у самых розных жанрах. Пісаліся вершы, песні, оперы... Стварэнне архітэктурнага ансамбля ў Хатыні — больш, чым увекавечанне памяці пра адну карную аперацыю ў дачной беларускай вёсцы...

Л. Р.: Традыцыя ўвекавечання памяці загінулых — агульначалавечая. Я нават выкарыстала ў адным са сваіх раманаў той факт, што ў 1918 годзе, пасля перамогі ў Першай сусветнай вайне, у Францыі было вырашана ўзвесці трыццаць тысяч помнікаў загінулым. І ўзвялі! Па ўсёй краіне... З іншага боку, магчыма, пабеднае прайсці нейкая часавая адлегласць, каб адбылося мастацкае асэнсаванне трагедыі? Згадаць літаратуру — знакамітая лейтэнанцкая проза, з усёй праўдай пра вайну, з'явілася ў шасцідзясятых... Хоць нараджаліся падобныя творы і непасрэдна ў час вайны. Згадаць хоць бы апавяданне Янкі Маўра «Завошта?» пра лёс сына Міхася Лынькова, якога разам з маці знішчылі ў канцлагеры... Ці апавяданне таго ж Міхася Лынькова «Васількі», пра забітага фашыстамі хлопчыка Мікопку — пісьменнік напісаў яго ў 1942-м, не ведаючы яшчэ пра лёс сваёй сям'і.

ЗВАНЫ ХАТЫНІ, МАЎЧАННЕ ЯМЫ

Г. Л.: Комплекс Хатыні зрабіўся ўзорам, даў кірунак. Нават у сучасным манументальным мастацтве... Мы, праязджаючы па новых аб'ектах, бачым цытаванне з таго мемарыяла, можа быць, нейкіх элементаў, фактур...

Л. Р.: Так, з'яўіўся наймагутнейшы вобраз «званы Хатыні», які стаў магістральным, і зразумела ўжо, што ён застанецца. Гэтак жа, як вобраз «вогненнай вёскі».

Г. Л.: У 1970-х шмат было асэнсавання ў графіцы...

Н. У.: Так, напрыклад, Васіль Шаранговіч тады стварыў цэлы графічны цыкл, прысвечаны Хатыні. Выдатная графіка. Як распавядала яго дачка Наталля, ён хлопчыкам перажыў вайну і запомніў пах гарэлага мяса ў спаленых вёсках, які яму не даваў спакою ўсё жыццё. Ён не мог есці шашлыкі, сядзець каля вогнішча... І таму, калі патралеў у мемарыял «Хатынь», зрабіў вельмі моцныя, вельмі экспрэсіўныя рэчы. Сёння мы іх выставілі... Вельмі ўражвае. Чорны, чырвоны, белы, шэры колеры... Мяне ўразіла яшчэ і кніга Леаніда Левіна пра Хатынь. Ён, дарэчы, вельмі добры пісьменнік. Ён апісвае, як выйшаў да іх гэты старэц, які выжыў у Хатыні, Камінскі. Распавёў усё, як ён памятаў. І вось той эмацыянальны запал Левін і калегі Градаў і Жанковіч здолелі не толькі адчуць самі, але і перадалі скульптару Селіханаву...

Г. Л.: Помнікі, якія з'явіліся ў першыя гады пасля вайны, — простыя абеліскі ці ўкленчаныя салдаты, не кажучы ўжо, што гэта часта былі тыповыя праекты, для могілак — такой была работа скульптара. А ў Хатыні ўсё іначай, скульптура робіцца часткай асяроддзя, часткай ландшафту памяці. Тое самае і ў мемарыяле ў Шунеўцы, і ў мемарыяле «Прарыў» ва Ушачах... І ў мінскай Яме, на месцы расстрэлу яўрэяў гета.

Л. Р.: Калі ўжо загаварылі пра Яму... Мяне прыводзілі туды мая мама. Мне было годзікаў пяць... Але ўрэзалася ў памяць на ўсё жыццё. Там яшчэ нічога не ўпарадкавалі... Не памятаю дакладна, ці ляжалі кветкі, ці стаяў той помнік, што ўстанавілі ў 1946-м, адзіны на тэрыторыі СССР помнік з яўрэйскімі надпісамі, якога афіцыйна не існавала. Здаецца, усё-такі стаяў. Невялічкі такі, сціплы... Пра тое месца не казалі. Мама мяне прывяла, распавяла, што тут здарылася. Як цяпер памятаю... Як я стаяла ў гэтай яміне, нада мной схілы, пакрослыя травой, здавалася, і прыцемак... І для мяне гэта таксама быў адзін вялікі мемарыял, які назаўсёды ўрэзаўся ў маю дзіцячую памяць. Мама расказвала, як сюды згналі тысячы людзей, у тым ліку дзетак. Што іх тут забілі, яны тут ляжаць... Дарэчы, пасля мне з Віталём Скалабанам давялося рыхтаваць матэрыял на архіўных дакументах, як змагаліся ў 1970-х за стварэнне ў Яме мемарыяла. Як старых людзей, якія тады прыходзілі з кветкамі, праганялі. І тое, што сёння гістарычная справядлівасць адноўленая, трэба цаніць і працаваць на захаванне памяці. Бо колькі тых сведкаў засталося? Я вельмі ўдзячная сваёй маме, што яна паспела мне многае распавесці.

Г. Л.: Так, сведкаў засталося мала. А для сучаснага пакалення мноіія словы трэба расшыфроўваць. Таму, вядома, трэба захаваць тое, што зроблена, і шукаць новыя формы, у тым ліку й манументальным мастацтве, як распавесці пра тыя падзеі. Але гэта павінны рабіць тыя, у каго ёсць патрэба, бо тут не можа быць кан'юнктуры, не можа быць маны, надумнасці. Распавед пра вайну мусіць быць толькі шчыры.

Л. Р.: Сёння гэта і ёсць вялікая небяспека — што стане афіцыёзным, перастане ўздзейнічаць на душу так, як павінна. Наш унучак Косцік ездзіў з намі ў мемарыял Красны Берег... Мама вазіла мяне на могілкі ў вёску Бор, дзе пахавалі астанкі спаленых жыхароў вёскі Люці. Помнік быў сціплы, белены, з шыльдачкай з прозвішчамі... Але мы ўсёй сям'ёй напярэдадні 9 Мая самі рабілі папяровыя кветкі, прыехаўшы ў вёску, хадзілі па дзераэу ў лес, каб упыргожыць вянок... І ўсё гэта пад расповеды маці і бабулі пра вайну. Гэта зусім іншае ўспрыняцце гістарычнай памяці...

Н. У.: У маі ў Палацы мастацтва дзейнічала выстава, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне. Перад ёй адбыўся круглы стол, на якім мы абмяркоўвалі тэму той вайны ў сучасным мастацтве. І заслужаны дзеяч мастацтваў Уладзімір Уродніч згадаў, што як толькі наступіла перабудова і зніклі дзяржаўныя заказы на ваенную тэму, тут жа гэтая тэма перастала быць магістральнай, верныя ёй засталіся толькі мастакі суполкі

«Традыцыя» і Студыя ваенных мастакоў пры Міністэрстве абароны. А сённяшняе маладое пакаленне мастакоў рэдка звяртаецца да тэмы вайны. Уладзімір Уродніч лічыць, што гэта няправільна, што трэба аднавіць дзяржаўныя заказы на творы ваеннай тэматыкі.

Г. Л.: Магчыма, у выяўленчым мастацтве і так. Але, наадварот, 1990-я ў манументальным мастацтве сталі росквітам творчага патэнцыялу скульптараў і архітэктараў у адлюстраванні ваеннай тэматыкі. Згадаць той жа Красны Берег...

Н. У.: Але ж гэта дзяржаўны заказ! Скульптар не будзе проста так працаваць.

Г. Л.: На Красны Берег не было заказу, пакуль не было прапановы. Ён сам спачатку з'явіўся праект... Яго ніхто не заказваў. Гэтак жа, як і мемарыял у Яме. Гэта была ўнутраная патрэба архітэктара і былых вязняў Мінскага гета. І мы цяпер з Аляксандрам Шапо зрабілі праект мемарыяла для Вілейкі — таксама па ўласнай ініцыятыве. 6 мая прайшла грамадская дыялогавая пляцоўка па абмеркаванні дадзенага праекта.

Л. Р.: А што за праект?

Г. Л.: У Вілейцы некалькі месцаў знішчэння яўрэяў. У адным з іх спалілі 130 чалавек. Побач ёсць скверык, які горад прапанаваў для стварэння мемарыяла ў памяць пра загінулых, а таксама ў гонар Праведнікаў сусвету Вілейшчыны і Супраціўлення. То-бок гэта будзе прастора памяці і архівам, і Супраціўленню, і праведніцтву, і расповед пра гісторыю горада. Мне ўвогуле падабаецца працаваць з лакальнымі ініцыятывамі, а не па заказах. Калі адчуваеш, як людзям на месцах гэта неабходна. Хоць, вядома, у такіх выпадках фінансаванне — заўсёды дыялогае пытанне. Сёння, на мой погляд, ёсць небяспека, што расповед пра ваенныя падзеі ператворыцца ў стварэнне «гранітных спаронак». Будуць шыльдачкі і дошкі. Гэта таксама добра і важна, але мы ўсё-такі кажам пра фарміраванне памяці ў прасторы. Асабліва тое важна для рэгіёнаў, як мы, напрыклад, зрабілі ў Глуску...

Н. У.: Ну дык а што задумалі ў Вілейцы?

Г. Л.: Комплекс... Квадратная лаўка, частка яе нібыта спаленая. Кожны, хто прыйдзе, зможа сесці на гэтую лаўку і праз абпаленую менору паглядзець на тую лазню, у якой спалілі людзей. Лаўка роздумаў. Будзе прысада Праведнікаў з гісторыямі выратавання. Будзем ужываць новыя тэхналогіі, QR-коды...

ПОШУКІ, ТРАДЫЦЫІ І... СТЭРЭАТЫПЫ

Л. Р.: Я рабіла на матэрыялах БДАМЛіМ артыкул пра гісторыю стварэння кнігі «Я з вогненнай вёскі...». Як аўтары — Адамовіч, Брыль і Калеснік — ездзілі па Беларусі і фактычна натыкляліся інфаркты, выслухоўваючы сведкаў. І калі кніга выйшла, не ўсе рыняліся ўчытаць, не страшныя падрабязнасці. Людзі ж распавядалі, як было — часам расстрэльвалі, палілі свае ж, паліцаі, а немцы толькі камандавалі... Часам хтосьці з нямецкіх ваенных праяўляў міласэрнасць... Зноў жа — савецкі чалавек мусіў выглядаць змагаром, а не безабаронны аховяран, ды яшчэ якая плача, просіць літасці. Народ хацелі бачыць на пастаменце.

Н. У.: То-бок мусіў быць помнік народатрыумфатара...

Л. Р.: Алесю Адамовічу давялося далей ірваць сэрца, абараняючы іх канцэпцыю.

Л. Г.: У тым і сіла мастака, што ён выцягвае тыя стрэмкі, якія прыносяць боль... Гэта таксама балюча, але пасля наступае палёгка, калі мы пачынаем гаварыць. Вось Хатынь зрабілі, і бацька піша — тыя, хто не вярнуўся ў свае спаленыя вёскі, адчулі, што іх боль, іх згуба, афіцыйна прызнаныя... Час пабіенне нарадзіць мастакоў — няважна, у якім відзе мастацтва: які раскрые яшчэ не раскрыты сюжэт аб вайне. Такіх тэм, мне здаецца, вельмі і вельмі шмат. Магчыма, пра іх і кажуць, але з пункту гледжання мастацтва яны не прагучалі. Вось Хатынь — прагучала... Красны Берег, тэма дзяцей-ахвяр вайны прагучала. Яма прагучала.

Л. Р.: Народны мастак Іван Якімавіч Міско прапаноўвае ўстанавіць помнік удовам вайны. Ён неадноўчы пераказваў мне канцэпцыю: «Такі помнік неабходны, ён паказаў бы тэму вайны ў новым ракурсе, паспрыяў бы выхаванню ў молядзі гістарычнай памяці, бо ў кожным родзе былі жанчыны, якія страцілі мужоў, братоў, сыноў... І кожны зможа пазнаць у такім помніку сваю маці, бабулю, прабабулю».

Г. Л.: Вельмі складаны быў лёс мемарыялізацыі Трасцянца. Розныя падыходы былі да мемарыялізацыі, дыскусіі...

Н. У.: Осіп Цадкін у 1953 годзе зрабіў скульптуру «Зруйнаваны Ратэрдам». Гэта проста скульптура, без арганізаванай прасторы. Заклік да нябёсаў. Дэфармаваная выява чалавека з вырваным сэрцам. І яна прагучала на ўвесь свет. Ён, напэўна, першы падобным чынам трактаваў тэму... Помнік зруйнаванаму гораду. Хоць, як нам бачыцца, нідэрландскія гарады былі зусім не так зруйнаваныя, як беларускія. Надзя Хадасевіч-Лежэ, калі прыязджала з Францыі ў расляваную Беларусь і чула, што яе маці падчас вайны жыла ў нейкай нары, выкапаной у зямлі, — не магла гэтага ўявіць,

паверыць... Бо Парыж у час вайны — гэта зусім іншыя ўмовы. Там працавалі кафэ, паказвалі кіно... Так, была небяспека. Але каб людзі жылі, як звяры, закопваючыся ў зямлю, таму што ўсё было знішчана, — Надзя Лежэ гэтага не разумела. Калі бачыш выявы зруйнаванага Мінска... Больш варта ставіць помнік не зруйнаванаму Ратэрдаму, а зруйнаванаму Мінску.

Л. Р.: Цікавая ідэя... Мая мама, дарэчы, з бабуляй дзесь у 1946-м садзілі дрэвы каля Опернага тэатра... І пра руіны я чула. Але пакуль не ўбачыла фота, не ўяўляла.

Н. У.: У Сталінградзе пакінулі зруйнаваны дом — як помнік... А ў Ленінградзе на адным з дамоў на Неўскім праспекце — аўтэнтычны надпіс «Гэты бок вуліцы пры артабстрэле найбольш небяспечны». Гэта геніяльная ідэя.

Г. Л.: Застаўся ў якасці мемарыяла разбураны французскі Арадур, горад-мемарыял.

Н. У.: Часам трэба штосьці пакінуць некранутым, каб было яскравае ўяўленне, як гэта выглядае — вайна, разбурэнні...

Г. Л.: Але натуральным было і тое, што пасля вайны хацелася ўсе руіны знесці і пачаць усё адноўляць. Натуральнае пачуццё чалавека, які страціў шмат і хоча працягваць жыць.

ПАРАНЕНАЯ КУЛЬТУРА

Л. Р.: Надзея, а па якім прынцыпе адбіраліся работы для выставы ў мастацкім музеі пра генацыд?

Н. У.: Па прынцыпе найярчэйшага выяўлення пакут народа. Гэта народныя мастакі — Паплаўскі, Шаранговіч і Савіцкі, і графіка Рана пра Мінскае гета.

Г. Л.: А ёсць жа, напэўна, мастакі, чые карціны пра вайну знаходзяцца па-за канцэптсам, якія раней не выстаўляліся...

Н. У.: Так, Шчамялёў, напрыклад, ужо ў 1974 годзе намалявай карціну «Палявы трыбунал. Апраўданне». Гэтая тэма нікім не падымалася. Ён сказаў, што напісаў карціну на падставе сваіх успамінаў і не збіраўся яе прадаваць. Толькі ў 2005 годзе Нацыянальны мастацкі музей набыў гэты ўнікальны твор.

Л. Р.: Значыць, будуць і яшчэ адкрыцці... Але і незваротныя страты. З якім шчымлівым пачуццём чытаеш трохтомнік «Скрыжалі памяці», дзе забраныя творы пісьменнікаў, што загінулі ў час вайны. Колькі выдатных твораў мы страцілі...

Н. У.: Так, пакутавалі людзі, але пакутавала і культура. І гэта таксама важны аспект. Нядаўна я пачала працаваць над артыкулам пра страты культуры ў гады вайны. Гэтыя страты зафіксаваныя. У 1947 годзе ўсім установам культуры загадалі напісаць, што страчана, і ацаніць. І ў нас ёсць гэтыя спісы. Яны агромністыя. Як ні дзіўна, яны не атрымалі шырокага распаўсюджання і дасюль не прааналізаваныя як след. І на адкрыцці выставы пра генацыд мы задумаліся, што трэба пазначыць у нашай экспазіцыі творы, якія ў час вайны былі страчаныя і вярнуліся, хоць і «параненыя»... Усяго іх каля 500, шостая частка збору. Дык вось, я высвятляю, што з 223 карцін калекцыі рускага жывапісу, якая ў нашым музеі была ў 1941 годзе, вярнулася 26 твораў. Выпадкова чырвонаармейцы знайшлі схованка пад Кёнігсбергам... А калі чытаеш, што было вывезена, што загінула, ці засталося, мабыць, дзесьці, пайшло ў іншыя музеі... Разумееш, як гэта жахліва. Ад калекцыі даваеннага беларускага мастацтва ў 957 адзінак мастацтва засталіся лічаныя творы... А абразы, а слуцкія паясы... А крыж Ефрасінні Полацкай!

Л. Р.: Здаецца, на гэтую тэму ўжо столькі даследаванняў, а крыж вярнуць не могуць...

Н. У.: Дарэчы, я прачытала дакумент, у якім дырэктар Магілёўскага музея І. С. Мігуліна піша ў 1939 годзе ў ЦК, крытыкуючы рашэнне стварыць у Мінску карцінную галерэю. Маўляў, нашто канцэнтраваць там усе экспанаты, абдзяляючы рэгіёны, а Мінск жа знаходзіцца ў некалькіх кіламетрах ад граніцы! І прапануўваў усё гэта перавезці ў Магілёў. Нагадаю, што тады граніца з Заходняй Беларуссю, якая знаходзілася пад уладай Польшчы, праходзіла каля Мінска. Мігуліна не паслухалі... Але ўсё-такі некаторыя рэчы, самыя цікавыя, у тым ліку Слуцкае Евангелле і крыж Ефрасінні Полацкай, залатыя рэчы з раскопак у Пампеях аддалі ў Магілёў. У выніку падчас вайны будынак Карціннай галерэі па вуліцы Карла Маркса ў Мінску застаўся цэлы, але галерэя была разрабавана, а ў Магілёўскі музей трапіла бомба. Згаданыя рарытэты знаходзіліся ў сейфе абкама і таксама былі вывезеныя... Была вывезена і наша невялікая (32 карціны) калекцыя заходнееўрапейскага мастацтва... Гэта былі артэфакты з магнацкіх палацаў і сядзіб арыстакратаў, якія звозілісі ў Мінск. Вядома, подзвіг дырэктара музея Аляксандра Аладавай у тым, што яна на падставе спісаў, якія былі зробленыя на аснове каталогаў выстаў, успамінаў мастакоў, актаў перадачы, пастаралася хоць бы тых жа мастакоў творы набыць і ў Мінск вярнуць. Мы маем сёння выдатны музей, але калі чытаеш, што там было... Музей займаў у 1939 годзе 15 залаў у будынку былой Марыінскай гімназіі. Пра гэта можна кніжку напісаць... Мы павінны ведаць, што мы страцілі, каб не думалі, што беларусы — нейкая жабрацкая нацыя, і ў нас нічога не было. Тут было ўсё!

Г. Л.: Хачу сказаць яшчэ пра адзін аспект... Пра неабходнасць бераўлівага стаўлення да створаных мемарыялаў і помнікаў. Не хачу нікога пакрыўдзіць, але нельга мармуровыя глыбы пры пад'ездзе ў Хатынь фарбаваць белай фарбай. Павінна быць пагадзіна да задумы аўтараў. Творы на тэму вайны і генацыду будуць працягвась з'яўляцца, кожны аўтар будзе шукаць свой падыход, і гэта трэба паважаць. Форма можа быць любой, галоўнае — не змяняць сутнасці, не здраджваць праўдзе.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «СА «ЗВЯЗДОЮ» ЛЕТА Ў РАДАСЦЬ!»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Са «Звяздою» лета ў радасць!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі. Тэрмін — з 1 чэрвеня 2022 года да 30 верасня 2022 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2022 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Са «Звяздою» лета ў радасць!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт., руб. кап.	Усяго з ПДВ, руб. кап.
1	Трымер электрычны Oasis TE-50 (далей — суперпрыз)	1	128,00	128,00
2	Апрыскавальнік садовы «Жук Класік» ОП-207/0444-00 (8 л), (далей — прыз)	7	51,996	363,97

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Са «Звяздою» лета ў радасць!» складае 491,97 (чатырыста дзевяноста адзін) рубель дзевяноста сем капеек).

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Са «Звяздою» лета ў радасць!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2022 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2022 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 чэрвеня па 17 ліпеня 2022 года выразаная з газеты або з дадаткоўка ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 чэрвеня да 17 ліпеня 2022 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, накленены на паперу ці плёнку, адксераканіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 21 ліпеня 2022 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Са «Звяздою» лета ў радасць!» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

члены Камісіі:

Юкэык Жанна Міхайлаўна — галоўны таваразнавец РУП «Белдрук»;

Ганцарэвіч Святлана Міхайлаўна — загадчык аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

11. Розыгрышы прызоў ажыццяўляецца па пасяджанні Камісіі 22 ліпеня 2022 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і гарадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя пасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адным для кожнага). Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім карты ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

Установа ў тэрмін да 30 ліпеня 2022 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умоваі выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2022 года.

Пры звароце па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2022 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2022 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 верасня 2022 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00 з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах: (017) 271 81 53, 311 17 40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаюцца.

20. Пасля 30 верасня 2022 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковаі справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, звязаных з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковаа ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Са «Звяздою» лета ў радасць!» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах: (017) 271 81 53, 311 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4195 ад 18.05.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 13 июня 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-130521 общей площадью 1862,8 кв. м (наименование: здание производственной базы; назначение: здание многофункциональное; составные части и принадлежности: трехэтажное из ж/б панелей и кирпича здание производственной базы); капитальное строение с инвентарным номером 600/С-165694 общей площадью 717,1 кв. м (наименование: склад-навес; назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: склад-навес А, площадка а1, ограждение а2, сеть электроснабжения Б, сеть водоснабжения В)
Сведения о земельном участке: площадь – 1,2993 га, кадастровый номер – 623650100001002871
Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, 1В, 1В/1
Начальная цена: 1 131 510,60 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка: 110 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию торгов, за проведение расчетов, иные затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения на оказание организатором торгов за правами и обязанностями стороны в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также предоставившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; копию паспорта, правоустанавливающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется по реквизитам: УП «Минское предприятие документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена продажи фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

